ЛІЛІЯ ЛУКАШЭНКА ПРА ФЕСТЫВАЛЬ «ВЫТОКІ»

5

ЯК ПРЫВАБІЦЬ БІЗНЕС ДА ВАДАСХОВІШЧА?

МС

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

30 ЛІПЕНЯ 2021 г.
ПЯТНІЦА
№ 144 (29513)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

+TV ПРАГРАМА

ЦЫТАТА ДНЯ

Раман ГАЛОЎЧАНКА, прэм'ер-міністр:

«Пад кіраўніцтвам Прэзідэнта наша краіна дастойна супрацьстаіць усім выклікам, з якімі мы сутыкаемся. Гэта і пандэмія, і санкцыі, і палітычны і эканамічны ціск калектыўнага Захаду. Пры гэтым захавана сацыяльная стабільнасць у грамадстве, забяспечваецца планамерны і нават звышпланавы рост заработнай платы. Сістэмна, адрасна і эфектыўна працуюць усе сацыяльныя службы краіны. Для таго каб у такіх умовах не проста выстаяць, а забяспечыць развіццё краіны ў адпаведнасці з намечанымі планамі, патрэбен якасны рост эканомікі. Гэта задача кожнага рэгіёна, з якіх і складаецца рост эканомікі краіны. Гэтае пытанне асноўнае на парадку дня. Гэта залог бяспекі і стабільнасці нашай дзяржавы. З усім астатнім мы справімся».

«ЗВЯЗДОЎСКІ» АДРАС — ЗАМОСЦЕ

Удзельнік і сведка стварэння гістарычнай мазаікі, былы старшыня калгаса Іван Іванавіч ПЯТРОВІЧ і загадчык Замосцкага сельскага Дома культуры Алена НЕЧАПУРЭНКА.

У вёсцы Слуцкага раёна нашаму выданню прысвечаны мурал

У вёску Замосце Слуцкага раёна давялося ісці пешшу пяць кіламетраў. Да Шышчыц з Мінска даехала на маршрутцы, выйшла на скрыжаванні дарогі, што вядзе да населенага пункта. Рэдкія машыны не спыняліся, праязджалі міма. Ну, што ж, дайду і на сваіх дваіх! Спачатку тры кіламетры да павароту на Замосце, затым яшчэ два да канчатковага пункту прызначэння — мясцовага Дома культуры.

Населены пункт сустрэў цішынёй, у двары, як той казаў, ні машын, ні людзей. Пажылыя ў такую спёку хаваюцца па хатах, а хто маладзейшы — на рабоце. Пара ў сельскай мясцовасці сапраўды гарачая — жніво.

Але відаць па ўсім, што жыццё тут не спыняецца: жылыя дамы з дагледжанымі дварамі тонуць у кветках і зеляніне. На ўскрайку вёскі віднеюцца катэджы, так званыя прэзідэнцкія домікі, пабудаваныя па рэспубліканскай праграме адраджэння і развіцця сяла. Прыкметна, што вядзецца і індывідуальнае будаўніцтва грамадзянамі на выдзеленых участках.

І вось нарэшце сустракаю першага чалавека. Гэта пажылая жанчына, якая ішла ў краму.

СТАР. 20–21

Рэпартаж з нагоды

КАЛІ ВАДА — БЯДА!

Карэспандэнт «Звязды» разам з супрацоўнікамі міліцыі і Таварыства ратавання на водах «праінспектавалі» Камсамольскае возера

Гэтае лета б'е не толькі тэмпературныя рэкорды — такой спёкі на працягу некалькіх тыдняў запар не прыпомняць нават старажылы. Напэўна, не згадаюць яны і такой вялікай колькасці тапельцаў, якая сёлета ну проста зашкальвае! Кожны тыдзень статыстыка несуцяшальная: дзясяткі людзей гінуць на водаёмах нашай краіны. За сухімі лічбамі і фактамі — чалавечыя жыцці, у тым ліку дзіцячыя...

СТАР. 4

КАРАТКА

• Надбаўкі, даплаты і сацыяльныя пенсіі вырастуць у Беларусі з 1 жніўня.

• **ФПБ прапанавала дадаткова рэгламентаваць умовы працы пры работах на вольным паветры.**

• У БДУ адбылося першае залічэнне на бюджэтную форму.

• **Жыхарка Гродна па просьбе тэлефонных махляроў устанавіла праграму і пазбавілася Br4 тыс.**

• Дзень беларускіх студатрадаў адсвяткуюць 1 жніўня.

• **Каля чатырох тысяч гектараў збожжавых загінула ад засухі ў Брэсцкай вобласці.**

ISSN 1990 — 763X

9 771990 763008 21144

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Быць адданымі свайму народу і дзяржаве»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка зрабіў кадравыя прызначэнні. Кіраўнік дзяржавы прызначыў Уладзіміра Калача памочнікам Прэзідэнта — інспектарам па Мінскай вобласці. Аляксандр Васільеў узначаліць Акадэмію Міністэрства ўнутраных спраў. Аляксандр Шастайла будзе займаць пасаду начальніка ўпраўлення ўнутраных спраў Гомельскага аблвыканкама.

Беларускі лідар узгадніў кандыдатуры Віктара Замосціка і Аляксандра Прановіча на пасады старшынь Ельскага і Мядзельскага райвыканкамаў адпаведна. Таксама Прэзідэнт узгадніў кандыдатуру Мікалая Палякова на пасаду кіраўніка адміністрацыі Цэнтральнага раёна горада Мінска. Аляксандр Лукашэнка даў згоду на прызначэнне Дзмітрыя Пятрушы генеральным дырэктарам адкрытага акцыянернага таварыства «Керамін», Міхаіла Касцечкі — генеральным дырэктарам закрытага акцыянернага таварыства «Беларуская нафтавая кампанія».

Прэзідэнт узгадніў прызначэнне новых кіраўнікоў вышэйшых навучальных устаноў. Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт цяпер узначаліць Аляксей Ягораў, а Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт — Мікалай Раманюк. Рэктарам Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта стане Аляксандр Унсовіч. Беларускі лідар даў згоду на прызначэнне новых кіраўнікоў консульскіх устаноў Рэспублікі Беларусь. Кірыл Драгун прызначаны генеральным консулам Рэспублікі Беларусь у Мюнхене, Руслан Варанкоў — генеральным консулам у Нью-Ёрку.

Па ўзгадненні Прэзідэнта Дзмітрый Рэзенкоў прызначаны членам Гродзенскага аблвыканкама. Узгоднены і кіраўнікі ў навукова-практычныя цэнтры НАН Беларусі: Дзмітрый Багдановіч — генеральны дырэктар навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па жывёлагадоўлі. Аляксей Мелянчэня — генеральны дырэктар навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па харчаванні. Яўген Федарэнка — начальнік аддзела падрыхтоўкі сумесных вучэнняў і трэніровак упраўлення сумеснай аператыўнай і баявой падрыхтоўкі цэнтра планавання прымянення і падрыхтоўкі войскаў (Калектыўных сіл) АДКБ Аб'яднанага штаба АДКБ.

УСЁ ЗАЛЕЖЫЦЬ АД КІРАЎНІКОЎ

Звяртаючыся да новых кіраўнікоў прадпрыемстваў, Аляксандр Лукашэнка акрэсліў шэраг задач, якія ім прыйдзецца выканаць на новых пасадах.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што «Керамін» знаходзіцца на кантролі ў Прэзідэнта. Па яго словах, гэта добрае прадпрыемства, якое мае патэнцыял, каб разгарнуцца і заняць свой рынак. Ён параіў новаму кіраўніку «Кераміна» Дзмітрыю Пятрушу не адставаць ад моды і ўдасканальваць новую прадукцыю.

Заняць сваё месца на рынку кіраўнік дзяржавы параіў і Міхаілу Касцечку, дырэктару Беларускай нафтавай кампаніі. «Мяне часта крытыкуюць, што я раблю стаўку на дзяржаўныя прадпрыемствы. Думаю, вы там вызначыцеся. Зноў жа, інтарэсаў там перасякаецца шмат. Не дай бог вы не вытрымаеце, вы павінны быць сумленным, прыстойным і правесці дзяржаўную лінію», — сказаў Прэзідэнт.

ВЫВЕСЦІ АДУКАЦЫЮ НА НОВЫ ЎЗРОВЕНЬ

Галоўнай задачай новых рэктараў вышэйшых навучальных устаноў Аляксандр Лукашэнка назваў кіраванне і арганізацыю навучальнага працэсу. «З ВНУ мы будзем разбірацца, і вельмі сур'ёзна. Мы з многімі рэктарамі рассталіся, таму што асноўная бяда — прыйшоў, у крэсла рэктара ўкінуўся і забыўся, што ў цябе тысяча чалавек, маладых, будучыня нашай краіны. Гэта будучая эліта нашага грамадства. Вынік мы таксама ўбачылі ў мінулым годзе. Нідзе няма такога стаўлення да студэнцкай моладзі, як у нас. Каб мы яшчэ мелі нейкія праблемы».

Прэзідэнт расказаў, што наступны год будзе прысвечаны адукацыі, ад 1 верасня гэтага года да 1 верасня наступнага. Па словах кіраўніка дзяржавы, трэба скончыць усе пачынанні і рэформы, ад падручніка і да навучальнага працэсу. «Усё мы павінны пералапаціць, паглядзець, што трэба дадаць, што прыбраць. Ачысціць ад лішняга адукацыю і вывесці яе на новы ўзровень», — сказаў ён.

У ліку прыярытэтных момантаў Аляксандр Лукашэнка назваў цэнтралізаванае тэсціраванне, паступленне, працаўладкаванне, заключэнне кантрактаў і дагавораў з тымі, хто паступае на платнае і бясплатнае навучанне. Галоўнымі пры гэтым застаюцца дысцыпліна і парадак у навучальным працэсе.

«Справа не толькі ў тым, што там хтосьці выскачыў і пачаў «Магутны божа» спяваць на вуліцы ці ў будынку. Не ў гэтым пытанне. Калі мы не ўскалыхнём адукацыю, мы будзем неканкурэтныя. Нашы студэнты — будучыя спецыялісты, яны будуць неканкурэтныя на рынку. Нават у Беларусі. А ўсе ж хочуць на Захадзе, яшчэ недзе папрацаваць. Мы не супраць. Пажадана, каб недзе папрацаваў, вопыту набраўся і назад вярнуўся. Трэба на прадмет сучасных падыходаў выпрацаваць крытэрыі і перабудаваць нашу адукацыю», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт падкрэсліў, што будзе патрабаваць у першую чаргу парадку ва ўніверсітэтах. «Усім студэнтам, якія да вас прыйдуць, вы павінны ўкласці ў розум, што гэта ваша краіна, якая ў яна ні была. Не бывае дрэннай краіны, як не бывае дрэнных бацькоў. Яна альбо ёсць, альбо няма. Тое ж самае і на прадпрыемствах, і ў іншых арганізацыях. Там студэнты, тут рабочыя. І ты як кіраўнік павінен іх весці за сабой. Калі няма выніку, вінаваты перш за ўсё кіраўнік», — акцэнтаваў ён.

«НАРОДУ ХОЧАЦЦА БАЧЫЦЬ СПАРТСМЕНАЎ З МЕДАЛЯМІ»

На злобу дня Прэзідэнт выказаўся наконт выступлення беларускіх спартсменаў на Алімпійскіх гульнях у Токіа.

«Мы фінансуем спорт больш за любую іншую краіну. Але што атрымліваем? Мы фінансуем фізкультуру і спорт, але мы забыліся пра тое, што краіне і народу хочацца бачыць спартсменаў з медалямі. І трэба з гэтай масы фізкультурна-спартыўнай, у якую мы ўкладваем вялікія грошы, выбіраць тых спартсменаў і каманды, якія заўтра прынясуць вынік. Вось гэта не зроблена. Таму, здаецца, і нядрэнна, усе займаюцца спортам. А медалёў няма. Чаму? Таму што не ўкладваем, зярняткі гэтыя не выбіраем і не выгадоўваем іх. Гэтая сацыяльная сфера мае патрэбу ў сур'ёзнай рэформе», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле слоў Прэзідэнта, сапраўдны спартсмен, які выдае вынік, павінен жыць добра, а астатнія павінны за імі цягнуцца. Тады і будзе вынік. «Таленавіты, прывёз славу краіне, медалі — атрымлівай усё, вось табе зямельны ўчастак, будуй дом. Вось табе вялікія грошы. Мы плацім, а некаторыя краіны не плацяць за перамогу на Алімпіядзе. Нарвегія — вельмі багатая краіна, і яны не плацяць, спартсмен лічыць за гонар выступаць за сваю краіну. А мы перавялі гэта на грошы», — заўважыў ён.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу і на ролю трэнера ў спартыўных дасягненнях. «Некаторыя краіны, у пяць разоў меншыя, чым наша, ужо маюць залатыя ўзнагароды. А мы ўсе радуемся, што мы ў фінал трапілі ў плаванні. Столькі ў тэніс укладваем, а вынік... Тут з трэнерамі трэба разабрацца. Першая віна — гэта трэнер. Калі ён са спартсменам дрэнна працаваў, то такі будзе вынік. Гэтак жа ў ВНУ. Калі рэктар на месцы, то і ва ўніверсітэце будзе парадак», — сказаў беларускі лідар.

«І ВАС ТАКСАМА Я НІКОЛІ НЕ ПАДВЯДУ»

Аляксандр Лукашэнка папрасіў новых кіраўнікоў даць шанц падначаленым. Але калі гэта здраднікі — ім не месца на прадпрыемстве. «Не паўтарыце маіх памылак, я вельмі многае дараваў, а потым яны вылезлі. Мінулы год — лакмусавая паперка для нас усіх, — сказаў ён.

Кіраўнік дзяржавы распавёў, што па некаторых кандыдатурах шмат разоў вяртаў дакументы на дадатковы разгляд, каб прэтэндэнта на тую ці іншую пасаду чыноўніка вывучылі яшчэ раз. «Нават вось кіраўнік Адміністрацыі сёння раніцай даведаўся, што ён (былы намеснік старшыні КДБ Уладзімір Калач) будзе прызначаны памочнікам Прэзідэнта. У мяне была тысяча пытанняў, але на ўсе пытанні я атрымаў адказы. Апошні адказ быў ад яго цяперашняга начальніка: учора позна ўвечары ён мне далажыў пра гэтага генерала, — раскрыў некаторыя падрабязнасці Аляксандр Лукашэнка. Ён акцэнтаваў увагу на тым, што да падбору кадраў вельмі акуратны падыход.

Па словах Прэзідэнта, мінулы год навучыў усіх, што ва ўладзе павінны быць дастойныя людзі. «Гэтая так званая дэмакратыя, якой наогул у свеце няма... Ужо ўсе пераканаліся ў гэтым, і дзякуй богу, што пераканаліся. І калі мы выходзілі з таго, што трэба свабоду даць пры прызначэнні, нейкае конкурснае саперніцтва павінна быць, павінны быць прафесіяналы і гэтак далей — усё гэта правільна, павінны быць прафесіяналы. Вось вы — прафесіяналы. Але не менш важная рыса — вы павінны быць адданыя свайму народу і дзяржаве», — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка.

Беларускі лідар адзначыў, што прафесіяналізм — гэта перш за ўсё вопыт. Ён пераканаўся, што ўсе прысутныя ў кабінеце — сапраўдныя прафесіяналы сваёй справы. «Я ведаю, што вы людзі дастойныя, і вельмі хачу, каб у вас атрымалася гэтая работа, з кім бы вы ні працавалі. Хто б ні быў у вас начальнікам, вы павінны быць прафесійнымі людзьмі, адданымі сваёй дзяржаве — гэта раўназначна «заўсёды адстойваць сваё меркаванне». І калі трэба кагосьці абараніць — значыць, трэба абараніць, у вас будзе нямала падначаленых. Нельга кідаць у адзіночку тых людзей, якія заслугоўваюць падтрымкі. Прынамсі, вы заўсёды знойдзеце ў мяне такую падтрымку», — паабяцаў Аляксандр Лукашэнка.

Каментарый у тэму

Пасля сустрэчы з Прэзідэнтам героі дня расказалі журналістам, якія бачаць перад сабой задачы на новых пасадах.

Аб'яднаць тэорыю і практыку

Новы **начальнік Акадэміі МУС Аляксандр ВАСІЛЬЕЎ** расказаў, што плануе звязаць навучальны працэс з практыкай. «Сусветнае грамадства развіваецца, але і злачыннасць, на жаль, не стаіць на месцы. Таму, безумоўна, як супрацоўнікам органаў унутраных спраў, так і ў цэлым грамадству трэба быць гатовымі да выклікаў, якія да нас прыходзяць перыядычна. У прыватнасці, і ад злачыннага свету», — адзначыў ён.

Аляксандр Васільеў падкрэсліў, што сёння актыўна развіваецца кіберзлачыннасць, на гэтым трэба акцэнтаваць увагу ў навучальным працэсе і падрыхтоўцы спецыялістаў. «У цэлым, цесная ўзаемасувязь павінна існаваць паміж тэрытарыяльнымі органамі ўнутраных спраў, так званымі практыкамі і тымі, хто на навучальным працэсе знаходзіцца. Таму што на сёння першая інфармацыя, якая паступае ад грамадзян, паступае, натуральна, у дзяжурныя часткі органаў унутраных спраў. Таму і рэагаванне ажыццяўляецца на тым узроўні, і пра новыя віды злачынстваў мы даведаемся адтуль. Своечасова на іх трэба не толькі рэагаваць, але і ўмець ім супрацьстаяць. Гэтыя задачы будуць стаяць перад навучаннем, перад падрыхтоўкай асабовага складу», — растлумачыў кіраўнік Акадэміі.

Генерал падкрэсліў, што новая пасада для яго — гэта магчымасць перадаваць назапашаны вопыт курсантам і тым супрацоўнікам, якія прыходзяць на перападрыхтоўку.

Дагэтуль Аляксандр Васільеў займаў пасаду начальніка ўпраўлення ўнутраных спраў Гомельскага аблвыканкама. Ён падзяліўся з журналістамі вынікамі сваёй работы: «У бягучым годзе мы дасягнулі вельмі высокага паказчыка ў раскрыцці асабліва цяжкіх і цяжкіх злачынстваў. Я лічу, што гэта вельмі важна. Больш за 87 працэнтаў было раскрыта і расследавана ў далейшым крымінальных спраў па злачынствах дадзенай катэгорыі. Спадзяюся, такія тэндэнцыі захаваюцца ў далейшым».

«Закон суровы, але гэта закон»

Новы **рэктар Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта Аляксей ЯГОРАЎ** раней з'яўляўся намеснікам старшыні пастаяннай камісіі па заканадаўстве Палаты прадстаўнікоў. Ён расказаў, як будзе прымяняць свой вопыт заканатворчасці на новай пасадзе. «Ёсць магчымасць зрабіць новы варыянт Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі. Мы ўжо прынялі шэраг дакументаў, якія рэгулююць нашу палітычную сістэму. І мы разумеем, што любое звяно, у тым ліку і ВНУ, у прыватнасці, — гэта адзін з элементаў палітычнай сістэмы. Не толькі непасрэдна законы аб адукацыі будуць прымяняцца, але і тыя дакументы, якія прынятыя ў іншых сферах. І тое, што мы сёння прынялі дэ-юрэ, павінна перайсці ў разрад дэ-факта. І, натуральна, мы павінны арыентаваць нашу моладзь на тое, што закон суровы, але гэта закон», — сказаў рэктар.

Аляксей Ягораў падкрэсліў, што будзе весці адкрыты дыялог з кожным: «З людзьмі трэба размаўляць, няхай гэта масціты выкладчык, доктар навук, або студэнт-першакурснік, які яшчэ нават не разумее, куды ён трапіў. Сёння з нашай моладдзю вельмі мала размаўляюць, нават іх бацькі, і шмат у чым таму мы атрымліваем адмоўныя вынікі ў плане функцыянавання палітычных аспектаў», — упэўнены ён.

«Стварыць пачын на будучыню»

Новы генеральны дырэктар ААТ «Керамін» Дзмітрый Пятруша падзяліўся задачамі, якія ставіць перад ім пасада. «Першай стаіць задача эканамічнага характару — выйсці на даходны ўзровень вытворчасці ў рэалізацыі прадукцыі. Мы не можам не скарыстацца сітуацыяй у свеце, калі ідзе перадзел рынку. І, на мой погляд, мы павінны гэтай сітуацыяй скарыстацца і стварыць пачын на будучыню, каб заняць новую долю рынку або ўвайсці туды, дзе мы не былі прадстаўленыя. Адна з асноўных задач — гэта работа з калектывам, там 2300 работнікаў. Гэта людзі, кожны чалавек асаблівы і трэба будзе да ўсіх падысці індывідуальна», — сказаў ён.

Валерыя СЦЯЦКО.

Забеспячэнне стабільнасці ў грамадстве і росту дабрабыту грамадзян

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ № 292, якім зацверджана Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2021—2025 гады, асноўныя палажэнні якой адобраны шостым Усебеларускім народным сходам. Пра гэта паведамілі ў прэс-службе Прэзідэнта.

Праграмай вызначаны мэты, задачы, прыярытэтныя напрамкі сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на пяцігоддзе, меры па іх рэалізацыі, мэтавыя індыкатары развіцця галін, сфер эканомікі і рэгіёнаў, а таксама чаканыя вынікі.

Галоўнай яе мэтай абрана забеспячэнне стабільнасці ў грамадстве і росту дабрабыту грамадзян за кошт мадэрнізацыі эканомікі, нарошчвання сацыяльнага капіталу, стварэння камфортных умоў для жыцця, працы і самарэалізацыі чалавека.

Развіццё Беларусі будзе грунтавацца на такіх прыярытэтах, як шчаслівая сям'я, моцныя рэгіёны, інтэлектуальная краіна, дзяржава-партнёр, накіраваных на ўмацаванне ўзаемнага даверу паміж дзяржавай і грамадствам, дзяржавай і чалавекам, дзяржавай і бізнесам. Для гэтага Праграмай прадугледжана вырашэнне найбольш актуальных для кожнага грамадзяніна нашай краіны пытанняў: даходы, занятасць, даступнае жыллё, бяспечны транспарт, даступныя і высокатэхналагічныя паслугі ў ахове здароўя, якасная адукацыя, развіццё рэгіёнаў. Асноваў для дабрабыту людзей стане рост даходаў на 20,2 працэнта.

У мэтах павышэння якасці дзяржаўнага кіравання намечаны пераход да паўнавартаснай галіновай палітыкі. У прыватнасці, зроблены акцэнт на распрацоўку стратэгій развіцця галін, прасоўванне інтарэсаў прадпрыемстваў усіх формаў уласнасці, перш за ўсё на знешніх рынках.

Вынікам рэалізацыі праграмы стане якасна новы ўзровень эканамічнага развіцця дзяржавы і адпаведна дабрабыту і якасці жыцця людзей.

Парламенцкі дзённік

НА БЕЛАРУСЬ ПРАЦЯГВАЕЦЦА НЕПРЫКРЫТЫ ЭКАНАМІЧНЫ І ПАЛІТЫЧНЫ ПРЭСІНГ

У Палаце прадстаўнікоў пад кіраўніцтвам Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзіміра АНДРЭЙЧАНКІ адбылося пасяджэнне Савета Палаты прадстаўнікоў, паведаміла БелТА. Парламентарыі абмеркавалі план падрыхтоўкі законапраектаў для разгляду на восеньскай сесіі, графік правядзення семінараў па вывучэнні практыкі прымянення заканадаўства і ўзаемадзеяння з мясцовымі органамі ўлады ў другім паўгоддзі 2021 года. Да разгляду на восеньскай сесіі парламента прапанаваны 18 законапраектаў і дэкрэт Прэзідэнта, заявіў Уладзімір Андрэйчанка.

«Дэпутацкім корпусам варта больш настойліва прасоўваць нацыянальныя інтарэсы па ўсіх вектарах знешнепалітычнай дзейнасці, не выключаючы заходні. Нягледзячы на тое, што тут нашы магчымасці некалькі абмежаваныя, гэтым кірункам трэба надаваць самую сур'ёзную ўвагу. Гаворка не толькі пра нашы афіцыйныя заявы на варожыя выпады ў адрас краіны і яе кіраўніцтва, якіх толькі ў гэтым годзе прынята каля дзесяці. Трэба шукаць каналы зносін, растлумачваць і даводзіць да калег-парламентарыяў, іншых замежных палітычных, дзяржаўных і грамадскіх дзеячаў, а таксама беларусаў замежжа аб'ектыўную інфармацыю аб сітуацыі ў Беларусі», — падкрэсліў Уладзімір Андрэйчанка.

Спікер заўважыў: сусветная супольнасць — гэта не толькі Захад. «Нам трэба нарошчваць міжпарламенцкія сувязі з краінамі Азіі, Афрыкі, Лацінскай Амерыкі, развіваць супрацоўніцтва з АСЕАН, Лацінаамерыканскім парламентам, Панафрыканскім парламентам, у поўнай меры задзейнічаць патэнцыял рабочых груп, — адзначыў ён. — Трэба ўмацаваць і пашырыць супрацоўніцтва з нашымі партнёрамі па Саюзнай дзяржаве, у межах Еўразійскага эканамічнага саюза і Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Рабочая група па справах беларусаў замежжа, узаемадзейнічаючы з іншымі рабочымі групамі Нацыянальнага сходу, МЗС, Міністэрствам культуры, Упаўнаважаным па справах рэлігій і нацыянальнасцяў і яго апаратам, павінна ўнесці важкі ўклад у вырашэнне гэтай задачы».

На жаль, на Беларусь працягваецца непрыкрыты экахімічны і палітычны прэсінг. «У гэтых умовах наша асноўная задача — забяспечыць эфектыўнае процідзеянне санкцыйнага ціску. Неабходна падтрымліваць рост эканомікі, перш за ўсё за кошт павышэння прадукцыйнасці работы, захавання традыцыйных рынкаў збыту і пашырэння прысутнасці беларускіх вытворцаў на рынках краін далёкай дугі. Прынцыпова важна таксама задзейнічаць патэнцыял міжпарламенцкай дыпламатыі для супрацьстаяння агрэсіўнай палітыцы калектыўнага Захаду і абароны нацыянальных інтарэсаў», — лічыць Уладзімір Андрэйчанка. Ён акцэнтаваў увагу, што прынцыпова важна, каб перагаворы з усімі партнёрамі былі напоўнены канкрэтным зместам.

Спікер падкрэсліў, што час патрабуе ад усіх органаў улады зладжаных, выверэных рашэнняў, накіраваных на абарону суверэнітэту і незалежнасці нашай краіны. «Асаблівую значнасць у гэтым плане мае работа на рэкэліроўцы Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Канстытуцыйнай камісіяй з удзелам дэпутатаў зроблена вялікая работа па абагульненні прапановаў, якія паступілі ад грамадзян, грамадскіх арганізацый, палітычных партый. Зараз ідзе дашліфоўка асобных палажэнняў праекта Асноўнага Закона краіны, пасля чаго дакумент будзе прадстаўлены на разгляд кіраўніку дзяржавы», — адзначыў Уладзімір Андрэйчанка.

Супрацоўніцтва

Беларусь удзячная Азербайджану за падтрымку ў міжпарламенцкіх арганізацыях

Пра гэта заявіў Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА падчас сустрэчы з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Азербайджана ў Беларусі Латыфам ГАНДЗІЛАВЫМ з нагоды завяршэння яго дыпмісіі ў нашай краіне, паведаміла БелТА.

«Вамі зроблена вельмі многае ў плане развіцця супрацоўніцтва паміж Азербайджанам і Беларуссю, а самае галоўнае — умацаванне дружбы паміж нашымі народамі. Важна, што, нягледзячы на пандэмію, не перарываліся нашы кантакты — палітычныя, гандлёва-эканамічныя, дэпутаты сустракаліся, рабочыя групы працавалі», — сказаў Уладзімір Андрэйчанка.

Паводле яго слоў, многае зроблена для развіцця міжпарламенцкіх сувязяў. «У нас і ў міжнародных арганізацыях вельмі канструктыўныя адносіны. Не толькі ў Парламенцкай асамблеі АБСЕ, але і ў ПАСЕ, дзе вы бераце непасрэдны ўдзел. Мы ўдзячныя азербайджанскім дэпутатам за такую канструктыўную пазіцыю, за голас, які вы заўсёды выказваеце супраць тых ангажаваных рэзалюцый, якія спрабуюць прыняць і прымаюць, на жаль, супраць Рэспублікі Беларусь. Нам важна і далей працягнуць такую работу ў міжнародных арганізацыях: і ў АБСЕ, і ў ПАСЕ», — адзначыў спікер. Уладзімір Андрэйчанка падкрэсліў, што ёсць перспектывы для развіцця гандлёва-эканамічных адносін. «Тут яшчэ шырокае поле дзейнасці па пастаўках прадуктаў харчавання і развіцця кааперацыі па зборцы тэхнікі», — заявіў ён.

«Мы блізкія, брацкія народы, але самае галоўнае — мы стратэгічныя партнёры. Гэта была прыемная місія ў Беларусі. Азербайджан на ўсіх пляцоўках падтрымліваў Беларусь і надалей будзе падтрымліваць. Мы заўсёды былі і будзем з вамі побач, і гэтая падтрымка будзе працягвацца ўсюды. Мы лічым няправільным умяшальніцтва ва ўнутраныя справы дзяржаў і таму наша братэрская падтрымка будзе заўсёды», — дадаў Латыф Гандзілаў.

Блізкая ўлада

ВЫКАНКАМЫ НА СУВЯЗІ

Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай «вертыкаллю» працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.

Тэлефонныя лініі ў суботу, 31 ліпеня, з 9.00 да 12.00 правядуць:

- намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Генадзь Іосіфавіч БАРЫСЮК. Тэл. 8 016 221 31 21;
- намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Барыс Сяргеевіч ЯФРЭМАЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;
- кіраўнік спраў Гомельскага аблвыканкама Алена Уладзіміраўна КЛІЧКОЎСКАЯ. Тэл. 8 023 233 12 37;
- першы намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Юрый Мікалаевіч ВАЛЯВАТЫ. Тэл. 8 015 273 56 44;
- намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый Анатолевіч МАЛАШКА. Тэл. 8 022 250 18 69;
- першы намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Сяргей Віктаравіч ЛЯЎКОВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;
- намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Юрый Уладзіміравіч ТРУШЧАНКА. Тэл. 8 017 222 44 44.

Надвор'е

Жнівеньскі паўднёвы вецер

На тэрыторыі нашай краіны такое сустракаецца нячаста. Завяршаецца другі месяц суцэльнага пекла. Напарадзе жнівень, які таксама паспрабуе пабіць тэмпературныя рэкорды. А ў найбліжэйшыя дні нас чакаюць душныя ночы і досыць гарачыя дні, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

У апошні дзень ліпеня ўмовы надвор'я будзе фарміраваць вобласць павышанага атмасфернага ціску, і толькі ўдзень па паўднёвым захадзе адаб'ецца ўплыў атмасфернага фронту, які перамяшчаецца з боку Заходняй Еўропы. Пераменная воблачнасць. Пераважна без ападкаў, толькі ўдзень месцамі па паўднёвым захадзе кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Вецер паўднёва-заходні ўмераны, пры навальніцах парывісты, уначы ў асобных раёнах па поўначы моцны парывісты. Тэмпература паветра ўначы ад плюс 11 градусаў да 18 цяпла, удзень паветра будзе разагравацца ад плюс 24 градусаў па паўночным захадзе да 32 цяпла па поўдні краіны.

На старце трэцяга месяца лета надвор'е абумовіць атмасферныя фронты, якія перамяшчаюцца з паўднёвага захаду Еўропы. У нядзелю чакаецца воблачнае з прасяненнямі надвор'е. На большай частцы тэрыторыі кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах навальніцы. Вецер паўднёва-заходні ўмераны, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ўначы нават павысіцца і стане ад плюс 13 градусаў да 20 цяпла. А ўдзень будзе плюс 23—29 градусаў, па поўдні — 30—31 цяпла.

Сяргей КУРКАЧ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

ААН заявіла аб рызыцы ператварэння М'янмы ў суперраспаўсюджвальніка кавіду

М'янма можа стаць дзяржавай, з якой каранавірус пачне некантралявана распаўсюджвацца па ўсіх краінах Паўднёва-Усходняй Азіі. Адпаведны прагноз спецыяльны дакладчык ААН па правах чалавека ў М'янме Том Эндрус выказаў у інтэрв'ю газеце The Guardian, паведаміла ТАСС. Па словах эксперта, цяпер дакладная колькасць выпадкаў заражэння каранавірусам і смяротных зыходаў з-за інфекцыі ў М'янме невядомая. Пры гэтым Том Эндрус адзначыў, што ў ААН праінфармаваныя аб рэзкім росце колькасці хворых. «Мы ведаем, што гэта рэзкая ўспышка. Гэта вельмі рэзкі, хуткі рост колькасці інфіцыраваных, — папярэдзіў ён. — М'янма становіцца суперраспаўсюджвальнікам вельмі заразных штамаў каранавіруса «дэльта» і іншых, надзвычай небяспечных і смяротных. Гэта вельмі небяспечна з многіх прычын». Дакладчык ААН па правах чалавека падкрэсліў, што ўрадам іншых краін, у тым ліку суседніх дзяржаў, неабходна аператыўна прыняць адпаведныя меры, каб пазбегнуць наступстваў распаўсюджвання каранавіруса за межамі М'янмы.

На поўдні Бразіліі выпаў снег

Тэмпература тут апусцілася ніжэй за восем градусаў па Цэльсію, паведаміла тэлекампанія Globo. Практычна на ўсёй тэрыторыі бразільскага штата Рыу-Грандзі-ду-Сул устанавіліся адмоўныя тэмпературы. Па прагнозах сіноптыкаў, халоднае надвор'е будзе захоўвацца і ў выхадныя дні, магчымы ледзяны дождж. Як паведаміла газета The Rio Times, рэдкі для Бразіліі холад не напалохаў жыхароў краіны. Многія едуць на поўдзень, каб убачыць снег на свае вочы. Турысты запаўняюць гасцініцы ў штаце Рыу-Грандзі-ду-Сул. Разам з тым маразы ўжо адбіліся на ўраджаі. Фермеры паведамляюць, што пацярпелі плантацыі кавы, цукровага трыснягу, бавоўны, кукурузы, розных агароднінных культур. Цэны на некаторыя віды сельгаспрадукцыі ўжо пайшлі ўверх. Чакаецца таксама значны рост цэн на каву і садавіну.

Сланцавы ландшафт Уэльса атрымаў статус Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА

Камітэт сусветнай спадчыны ўхваліў заяўку Вялікабрытаніі, і сланцавы ландшафт паўночна-заходняга Уэльса стаў 32-м аб'ектам у краіне ў гэтым прэстыжным спісе. Сланец са Сноўдоніі, што ў графстве Гвінед, лічыўся «сусветнай чарапіцай XIX стагоддзя», паколькі яго экспартавалі па ўсім свеце і часта ўжывалі для дахаў, адзначыла «Бі-бі-сі». Камітэт сусветнай спадчыны ЮНЕСКА прысуджвае гэты статус аб'ектам «выдатнай універсальнай каштоўнасці», якія павінны быць «унікальнай славутасцю» і мець «культурнае, гістарычнае або фізічнае значэнне». Сёлета ў прэстыжны спіс ужо трапілі адзінаццаць вялікіх курортных гарадоў Еўропы, Галандская лінія воднай аховы і Трансіранская чыгунка. Міністр па справах спадчыны ўрада Вялікабрытаніі Кэралайн Дзінендж заўважыла, што «статус Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА — велізарнае дасягненне і сведчанне значэння, якое гэты рэгіён меў у прамысловай рэвалюцыі».

КАЛІ ВАДА — БЯДА!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Аднак ахвяр магло быць значна больш: кожны дзень супрацоўнікі Таварыства ратавання на водах, МНС і міліцыі выцягваюць з вады тых, хто тоне. А колькі намаганняў прыкладаецца на папярэджанне падобных трагедый! Каб пераканацца ў гэтым асабіста, карэспандэнт «Звязды» выправілася разам з праваахоўнікамі на дзяжурства па Камсамольскім возеры.

СВЯДОМА РЫЗЫКУЮЦЬ ЖЫЦЦЁМ

Гэта найбуйнейшая акваторыя сталіцы. У разгар сезона на пляжы Камсамольскага возера нават яблыку няма дзе ўпасці. Як селядцоў, людзей і ў вадзе. Мінчане і госці горада адпачываюць, а за тое, каб гэты адпачынак быў максімальна бяспечны, з самага ранку і да позняга вечара адказваюць ратавальнікі і праваахоўнікі.

Разам з супрацоўнікамі Таварыства ратавання на водах і міліцыі мы абследуем усю берагавую лінію Камсамольскага возера на катары. Нягледзячы на тое, што для купання прызначана толькі пэўная зона, людзі свядома лезуць у ваду там, дзе гэта забаронена. Прычым многія з іх добра разумеюць, што рызыкуюць сваім жыццём.

Вось і цяпер. Ратавальнікі спыняюць лёгкаматорнае судна каля аднаго з прычалаў, дзе купаецца пажылы мужчына. На просьбу вылезці з вады пенсіянер кажа: «А навошта вы сюды прыехалі? Я ж яшчэ не тануў...» Ну што тут скажаш — дзіўная рэакцыя дарослага чалавека.

Матор заведзены, едзем далей. На катамаране катаецца маладая пара. Абое — без камізэлькі бяспекі. А да берага, між іншым, далекавата. Цяпер маладыя людзі абышліся заўвагай. Калі яны трапяць ратавальнікам на вочы без камізэлек яшчэ раз, то далей з імі будуць размаўляць супрацоўнікі міліцыі — за невыкананне правілаў бяспекі на вадзе прадугледжаны штраф ад дзвюх да 20 базавых велічынь.

АЛКАГОЛЬ — ПРЫЧЫНА БОЛЬШАСЦІ ТРАГЕДЫЙ

Па дапамогу да праваахоўнікаў ратавальнікі звяртаюцца падчас дзяжурстваў рэгулярна. Ігнараванне людзьмі правілаў катання на катамаранах ці катарах — гэта паўбяды. Сапраўдная бяда ў тым, што ў ваду лезуць людзі, якія знаходзяцца «пад градусам». А ў стане алкагольнага ап'янення, як вядома, да трагедыі — адзін крок.



— Сёння раніцай мы, напрыклад, ратавалі жанчыну, якая п'яная знаходзілася ў вадзе, — расказвае **вадалаз ратавальнай станцыі «Камсамольскае возера» Аляксей БАКУМАЎ.** — Больш за тое, яна купалася ў забароненым для гэтага месцы. Калі стала відавочна, што жанчына не можа самастойна выбрацца на бераг, мы кінуліся на дапамогу. Яшчэ б некалькі хвілін, і магла здарыцца трагедыя...

Тое, што людзям у стане алкагольнага ап'янення няма чаго рабіць у грамадскіх месцах, ведаюць усе. Барані божа, калі «пад мухай» яны лезуць у ваду. Каб не дапусціць гэтага, рэгулярна каля вадаёма дзяжурыць патрульна-паставы нарад міліцыі. Пільныя грамадзяне ёсць і сярод тых, хто адпачывае. Акурат падчас нашага сумеснага дзяжурства ў аператыўную службу міліцыі паступіла паведамленне, што на пляжы возера кампанія мужчын ужывае алкагольныя напоі, сваімі паводзінамі яны перашкаджаюць адпачываць навакольным. Інфармацыю перадалі нараду, які дзяжурыў на дадзеным маршруце.

Як высветлілася, у міліцыю звярнуўся вартаўнік летняга кафэ. Выслухаўшы яго скаргу, праваахоўнікі хутка вылічылі п'яную кампанію. Мужчыны сярэдніх гадоў, акрамя таго што знаходзіліся ў грамадскім месцы ў моцным алкагольным ап'яненні, дык яшчэ і чапляліся да жанчын, якія загаралі побач. Парушальнікаў правапарадку затрымалі і даставілі ў найбліжэйшае РУУС. У першую чаргу, каб папярэдзіць яшчэ адну трагедыю на вадзе.

— Зоны адпачынку, лясныя масівы, берагі рэк, азёраў, пляжы з'яўляюцца

грамадскімі месцамі: ужыванне спіртнога там катэгарычна забаронена, — нагадвае **намеснік начальніка аддзела аховы правапарадку і прафілактыкі Цэнтральнага РУУС Мінска падпалкоўнік міліцыі Мікалай СМОЛЬСКІ.** — За гэта прадугледжаны штраф у памеры да васьмі базавых велічынь. За купанне ў забароненых месцах — штраф да трох базавых. Нельга забывацца і пра асноўныя правілы асабістай і маёмаснай бяспекі ў месцах масавага адпачынку. Каб пазбегнуць непрыемнасцяў, звязаных з крадзяжом каштоўных рэчаў, рэкамендуем адпачывальнікам не пакідаць свае рэчы без догляду пры наведванні пляжа. Трэба адзначыць, што ў параўнанні з мінулымі гадамі правапарушэнняў каля вадаёмаў стала менш, у першую чаргу гэта датычыцца крадзяжоў. Людзі ведаюць, што ў любой сітуацыі яны могуць разлічваць на дапамогу супрацоўнікаў міліцыі, якія пастаянна прысутнічаюць на пляжы. Гэты факт, дарэчы, дысцыплінуе зладзеяў, якія некалькі разоў падумаюць, перш чым здзейсніць правапарушэнне.

ДЗЕЦІ Ў ПОЛІ ЗРОКУ ДАРОСЛЫХ

Дзяжурства працягваецца. Да нас далучылася **інспектар па справах непаўналетніх Цэнтральнага РУУС Надзея КАЛІБЕРАВА.** Падчас летняга сезона старшы лейтэнант міліцыі на пляжы бывае рэгулярна. І, вядома, не для таго, каб адпачываць. На кантролі інспектара — дзеці, некаторыя з якіх хоць і прыходзяць на возера з дарослымі, трапляюць у небяспечныя сітуацыі.

— Класічны прыклад: маці настолькі захопленая фатаграфаваннем сябе, што не бачыць, што яе маленькае дзіця ўжо знаходзіцца ў вадзе, — расказвае Надзея Каліберава. — Нямала і сітуацый, калі бацькі галавы не адрываюць з гаджэтаў, а дзеці ходзяць па пляжы і шукаюць сваіх маці. Часта падлеткі ўвогуле знаходзяцца на возеры без дарослых. Калі пачынаеш разбірацца, высвятляецца, што дзеці прыйшлі сюды без дазволу бацькоў, якія нават не здагадваюцца аб гэтым. А між іншым, знаходжанне дзяцей да 14 гадоў без дарослых каля вадаёмаў пагражае адміністрацыйнай адказнасцю.

Днямі рулявы матарыст ратавальнай станцыі «Камсамольскае возера» Павел Лялевіч выцягнуў з вады дзевяцігадовага хлопчыка. Малы ўпаў з парапета і пачаў тануць. Ратавальнікі адрэагавалі аператыўна — жыццю і здароўю хлопчыка нічога не пагражае. А да трагедыі быў усяго адзін крок... І ці змог бы тады спаць спакойна бацька дзіцяці, які знаходзіўся побач, але не змог аказаць дапамогу сыну, бо быў у моцным алкагольным ап'яненні?

Выратавалі дзіця, якое днямі танула на Цнянскім вадасховішчы, і супрацоўнікі міліцыі. Ажыццяўляючы патруляванне каля берагавой лініі, праваахоўнікі ўбачылі хлопчыка, які боўтаўся ў вадзе. Спачатку ім падалося, што малы забаўляецца, але як толькі міліцыянеры пачулі крык аб дапамозе, адразу ж кінуліся ў ваду. Як высветлілася потым, 12-гадовы падлетак адпачываў на вадасховішчы з мамай і сястрой. Дзеці гулялі ў мячык, як раптам той трапіў у ваду. Хлопчык пабег за ім і пачаў тануць. На шчасце, праваахоўнікі былі побач.

Гэта добра, што ёсць людзі, якія аб нас клапоцяцца і, калі спатрэбіцца, прыйдуць на дапамогу. Аднак так бывае не заўсёды, бо часта да бяды — усяго адзін крок, і не заўжды той жа ратавальнік ці міліцыянер можа паспець. Таму будзьце пільныя! Асабліва калі вы адпачываеце каля вадаёма са сваімі дзецьмі, якія заўжды павінны быць у полі вашага зроку.

Вераніка КАНЮТА.
Фота Таццяны АБОЗНАЙ.

Алімпійскі дзённік

КАРАЛЕВА СПОРТУ ЗБІРАЕ НА БАЛЬ

Спаборніцтвы — гэта не толькі метры, секунды, балы, за кожным стаіць чалавечая гісторыя. Расказваем, чаму падтрымліваць беларусаў варта нават тым, хто не лічыць сябе аматарам спорту.
Сёння, 30 ліпеня, у барацьбу за алімпійскія медалі ўступаюць лёгкаатлеты. Каманда ў гэтым відзе спорту самая вялікая ва ўсёй беларускай дэлегацыі — 34 спартсмены ў 17 дысцыплінах. Расказваем, хто з беларусаў будзе абараняць гонар Каралевы спорту ў Токіа.

СКАЧКІ Ў ВЫШЫНЮ. Галоўная зорка гэтай дысцыпліны — Максім Недасекаў. У пачатку ліпеня яму скарылася вышыня ў 2 м 37 см, што стала новым нацыянальным рэкордам. Для параўнання, залаты вынік Алімпіяды ў Рыа — 2 м 38 см, сярэбраны — 2 м 36 см. Амаль што цудоўным чынам на Алімпіяду трапіў Дзмітрый Набокаў. У 2020 годзе спартсмен быў дыскваліфікаваны на два гады, у яго допінг-пробе знайшлі забаронены фурасемід. Але літаральна за месяц да Алімпійскіх гульняў скакуна апраўдалі. А рэйтынгу Дзмітрыя хапіла, каб адправіцца на галоўныя старты.

КІДАННЕ ДЫСКА. У дадзенай дысцыпліне пад беларускім сцягам будзе выступаць толькі Яўген Багуцкі. На майскім Кубку Еўропы па кіданнях у маладзёжных стартах (U-23) Яўген перамог, усталяваўшы рэкорд спаборніцтваў — 64 м 73 см.

БЕГ НА 100 І 200 МЕТРАЎ. На «гладкіх» спрынтарскіх дыстанцыях Беларусь будзе абараняць самая хуткая спартсменка краіны Крысціна Ціманоўская, пераможца Універсіяды 2019 года. Летні алімпійскі сезон Крысціна пачала з перамог на міжнародных стартах.

У трайным скачку краіну прадставіць Віялета Скварцова. Яна прымусіла ўвесь свет паважаць сябе ў 2017 годзе. І не толькі таму, што перамагла на чэмпіянаце Еўропы сярод дзяўчат, а яшчэ і таму, што горда сышла з п'едэстала, калі арганізатары памылкова ўключылі чужы гімн.

ШТУРХАННЕ ЯДРА. Тут адказнасць за беларускі поспех ляжа на плечы Алёны Дубіцкай, бронзавага прызёра чэмпіяната Еўропы 2018 года. За месяц да Алімпійскіх гульняў, на чэмпіянаце Беларусі, яна пераможна ўстанавіла новы асабісты рэкорд — 19,65. Праўда, для алімпійскага медаля трэба крыху накінуць, на Алімпіядзе найлепшыя спартсменкі адпраўляюць снарад больш чым на 20 метраў.

НЕПРАДБАЧАНЫЯ АБСТАВІНЫ. Дар'я Барысевіч, якая атрымала сур'ёзную траўму, не адзіная беларуская лёгкаатлетка, якая не выйдзе на алімпійскія старты. Удзел у Гульнях не возьме і Марыя Жодзік. Нарматыў на Гульні ў скачках у вышыню яна выканала ў чэрвені на чэмпіянаце Беларусі. Але незалежны орган па барацьбе з негатыўнымі з'явамі ў лёгкай атлетыцы (Athletics Integrity Unit, AIU) не дазволіў Марыі і дзвюм прадстаўніцам эстафетнай каманды выступіць на Алімпіядзе. Прычына — недастатковая колькасць допінг-проб, узятых у спартсменак пасля таго, як яны выканалі алімпійскі нарматыў.

«Па патрабаванні AIU, Жодзік і дзве нашы спрынтаршы Ганна Міхайлава і Крысціна Мулярчык абавязаны прайсці тры пазаспаборніцкія допінг-тэсты з інтэрвалам у 21 дзень да старту Гульняў. Вядома, дзяўчаты ніяк не паспявалі гэта зрабіць. Спадзяваліся, што нам пойдуць насустрач, аднак спартсменаў у лёгкай атлетыцы, якія апынуліся ў такой сітуацыі, у свеце 20 чалавек. У агенцтве разважылі: калі дазволіць аднаму, то і астатнім трэба дазваляць. А без праходжання дадатковых тэстаў атлетамі агенцтва рызыкуе прапусціць каго-небудзь перад Гульнямі. Таму забаранілі ўсім, хто апынуўся ў такой сітуацыі. Хоць на маю думку, у дачыненні да маладых спартсменаў гэтае патрабаванне трэба перагледзець. Калі эліта ўвесь час знаходзіцца пад кантролем антыдопінгавых структур, то моладзь таксама павінна атрымаць свой шанц выступіць на Гульнях», — растлумачыў **галоўны трэнер беларускай каманды па лёгкай атлетыцы Юрый МАІСЕВІЧ** прэс-службе Нацыянальнага Алімпійскага камітэта.

Ён запэўніў, што ў эстафеце 4х100 у жанчын наша каманда сфарміруе новы састаў і паспрабуе выступіць у кваліфікацыі 6 жніўня.

Валерыя СЦЯЦКО.

Лілія ЛУКАШЭНКА:

«Любоў да мастацтва была паўсюль і ва ўсе часы»

Лейтматыў гэтага лета, спартыўна-масавае мерапрыемства «Вытокі. Крок да Алімпу», скончыла сваё падарожжа па рэгіёнах Беларусі. Ліда, Орша, Кобрын, Мазыр, Бабруйск, Салігорск — гарады, якія паклалі пачатак новай гісторыі. Абавязковым пунктам праграмы ў кожным горадзе была выстаўка работ сучаснага беларускага мастацтва «Кола часу» і выстаўка конкурсу дзіцячых малюнкаў «Мой крок да Алімпу». Вернісаж адкрываўся ў першы дзень фестывалю і цэлыя выхадныя радаваў сваіх наведвальнікаў. Усё гэта было магчыма дзякуючы галерэі «АртХаос». Кіраўнік галерэі Лілія Лукашэнка падзялілася вопытам удзелу ў фестывалі «Вытокі. Крок да Алімпу» і расказала, чаму сучаснае беларускае мастацтва вартае ўвагі.

— Лілія Валер'еўна, падвядзіце, калі ласка, вынік выстаўкі «Кола часу» ў прыватнасці і ўсяго фестывалю «Вытокі. Крок да Алімпу» ў цэлым. Усё задуманае ўдалося выканаць?

— Кожны раз у пачатку новага праекта плануецца многае, але потым на месцы прыходзіцца нешта мяняць, падстройвацца пад новы горад. Нешта не атрымліваецца, мяняецца ці ўвогуле здараецца штосьці нечаканае, але прыемнае. Галоўная тэма нашага праекта «Вытокі. Крок да Алімпу» — паказаць тое, з чаго ўсё пачынаецца, адкуль мы чэрпаем свае сілы. І ў кожным горадзе мы рабілі акцэнт на адметнасцях, на якіх варта засяродзіць увагу. У гэтым мы дасягнулі таго, да чаго імкнуліся. Мы хацелі падняць пласт нашага нацыянальнага, традыцыйнага. Мы стараліся звярнуць увагу на тое, што мы краіна з багатай гісторыяй, цікавымі традыцыямі, якія, на жаль, сыходзяць у нябыт, а мы жывём сучаснымі «Цік-Токам», «Інстраграмам» і ўвогуле імкнёмся быць падобнымі да некага. Наша праблема ў тым, што мы пад некага падстройваемся. Але наша культура такая, якая ёсць, і гэтым яна адметная. І выстаўка таксама тое паказвае.

— Цікава, што ў кожным горадзе фестываль пачынаўся з прэзентацыі мясцовай гісторыка-культурнай спадчыны. А вы дэманструеце людзям сучаснае мастацтва. Атрымліваецца кола часу ў дзеянні...

— Сама ідэя фестывалю ад чатырох арганізатараў прадугледжвае нестандартны фармат. У нас некалькі кірункаў і кожны самадастатковы, мы паспрабавалі аб'яднаць, здавалася б, несумяшчальныя рэчы — спорт, культуру і адукацыю. І мне здаецца, нам гэта ўдалося і атрымаўся добры сямейны фестываль. У кожнага з чатырох арганізатараў была свая ідэя і свае чаканні ад праекта. І разам мы прыйшлі да агульнай канцэпцыі, якая аказалася ўдалай. Проста ідэйныя людзі аб'ядналіся ў адну каманду і знайшлі агульную мову. Ідэя падняць нашы традыцыі, культуру, паказаць мастацтва адлюстравалася ў праграме, якой мы прытрымліваліся ў кожным рэгіёне. Нават калі хтосьці з рэгіёнаў хацеў прыўнесці нешта сваё, мы прасілі не адступаць ад канцэпцыі, бо ў ёй аб'ядналіся традыцыйная і сучасная культура з плаўным пераходам да спартыўнай праграмы. Людзі ўжо так стаміліся ад пандэмійнага напружання, ім проста хочацца свята. І мы былі рады яго падарыць.

— Для галерэі «АртХаос» гэта першы вопыт удзелу ў такім буйным рэспубліканскім праекце?

— Можна сказаць, што першы. Галерэя ўдзельнічае ў «Славянскім базары», там працуе наша выстаўка. Але ў такім маштабным фестывалі — упершыню. Заўсёды хочацца вырвацца за межы, новыя павевы прыносяць пазітыў і натхненне. І гэта вельмі важна. У Мінску ўсё сканцэнтравана, там усё ёсць. А мы хацелі падзяліцца гэтай творчасцю з рэгіёнамі і паказаць, што таварыць можна ўсюды.

— Як з'явілася ідэя конкурсу дзіцячых малюнкаў? Гэта спроба прыцягнуць моладзь да фестывалю?

— Назва конкурсу — «Мой крок да Алімпу», і калі да нас звярталіся з пытаннем «што намаляваць», мы адказвалі, што крок да Алімпу ў кожнага свой і неабавязкова ў спорце. Мы прасілі дзяцей паказваць свае дасягненні ў розных сферах. Зразумела, што ў іх крыху іншае разуменне, хоць былі вельмі цікавыя работы. Безумоўна, не ўсе дзеці, якія займаюцца ў мастацкіх студыях, стануць мастакамі. Мы вырашылі аб'яднаць дзіцячыя малюнкі і карціны мастакоў у адной зале, каб зматываваць дзяцей не спыняцца на дасягнутым і ісці наперад. Хочацца, каб таленавітыя дзеці знайшлі сябе ў жыцці.

— Вельмі запамінаецца работа, дзе намаляваны малы, які вучыцца поўзаць...

— Так, гэта ж таксама крок да Алімпу! Была дзяўчынка, якая намалявала свае ўражанні ад моманту, калі ёй уручалі дыплом. У дзяцей дастаткова глыбокі ўнутраны свет, і калі яго не заганяць у рамкі і не навязваць тэму, то яны праявяць сябе ва ўсёй разнастайнасці. Дзецям у гэтым плане трэба даваць свабоду.

— Падчас спартыўнага квэсту трэнеры адзначалі таленавітых, перспектыўных дзяцей, якіх запрашалі ў спартыўныя секцыі. У вашай мастацкай галіне такі прынцып прасочваўся?

— У нас крыху іншы фармат. Мы ўсе работы з конкурсу малюнкаў уважліва праглядалі і выбіралі тры найлепшыя, плюс прыз глядацкіх сімпатый. Мы зробім выстаўку найлепшых работ ад кожнага рэгіёна ў нашай галерэі, у Мінску. І плануем выпусціць буклет з гэтымі работамі. Няхай ён будзе невялікі, але для дзяцей гэта ўжо Алімп. Зразумела, што мы не зможам назіраць за кожным дзіцем, бо яны ўсе жывуць у розных рэгіёнах. Але дзіця, якое хоча тварыць, мае імкненне і талент, не павінна страціць свой стрыжань, сваю мару, і мы спрабуем у гэтым дапамагчы.

— Лілія Валер'еўна, вы адзначалі, што ідэя выстаўкі — сабраць розных сучасных мастакоў. А ці звярталі ўвагу на месца нараджэння гэтых мастакоў, каб сабраць яшчэ і прадстаўнікоў усіх рэгіёнаў?

— Мэтанакіравана — не. Выбіраючы карціны, мы хацелі паказаць разнастайнасць стыляў і напрамкаў. Мы хацелі паказаць і дзецям, што кожны мастак па-свойму сябе выражае. І па волі лёсу атрымалася так, што прадстаўлены амаль усе вобласці. Некаторыя мастакі нават родам з мясцін, дзе праходзілі «Вытокі».

— А ў якім горадзе была самая яркая зваротная сувязь ад наведвальнікаў выстаўкі?

— Калі пачынаецца новы праект, да яго шмат увагі. Людзі яго не ведаюць і разважаюць, удзяляць яму свой час ці не. А калі ўключаецца «сарафаннае радыё», то і інтарэс расце. Так і ў нас атрымалася. Спрацавала «сарафаннае радыё». Зваротная сувязь пайшла па нарастаючай. І не таму, што адзін горад прымаў нас лепш, а другі — горш. А таму, што з кожным горадам мы станавіліся больш познавальныя. І ад горада да горада нас больш чакалі людзі, і нават дзеці больш актыўна дасылалі малюнкі.

— Так склалася, што амаль усё, у тым ліку і культурнае жыццё, сканцэтравана ў сталіцы. А як развіваецца сучасны жывапіс у рэгіёнах?

— Любоў да мастацтва была паўсюль і ва ўсе часы. Але дадзеная сфера ніколі не была масавай. Гэта ў першую чаргу парыванне чалавека, покліч яго душы, незалежна ад месца пражывання. Вядома, любая сталіца мае перавагу, бо яна збірае ўсё найлепшае. Але ўсё роўна культурнае жыццё ў рэгіёнах ёсць. І так прыемна, калі на нашу выстаўку прыходзілі людзі, якія ўжо засумавалі па культурных падзеях, чакалі іх. Магчыма, у рэгіёнаў менш шанцаў убачыць нешта маштабнае. Але яны стараюцца сваімі сіламі. І задача «Вытокаў» — прыцягнуць, зацікавіць людзей прыйсці, паглядзець і адкрыць для сябе нешта новае ці проста атрымаць асалоду.

Фота аўтара.

— Якія тэндэнцыі ў сучасным беларускім жывапісе вы як спецыяліст можаце вылучыць?

— У нас заўсёды былі выдатныя мастацкія школы, і, на маю думку, вельмі добра, што захаваліся іх традыцыі. Мне імпануе, што наша мастацтва грунтуецца на традыцыях. Безумоўна, нашы мастакі вучацца ў замежных калег, нешта пераймаюць. І мяне радуе, што ў нас ёсць усё — ад традыцыйнага да сучаснага. Хацелася б яшчэ звярнуць увагу на такі момант. Сёння ўсё можна ўбачыць у інтэрнэце. Але ні адна карціна праз экран поўнасцю на раскрыецца, не перадасць эмоцыі. І нам хочацца, каб людзі зразумелі, што калі кантактуеш з тым ці іншым творам анлайн і ўжывую — гэта зусім іншыя эмоцыі і зусім іншы вынік такога ўзаемадзеяння.

— У выстаўцы можна ўбачыць шмат пейзажаў, то-бок сучасныя мастакі вяртаюцца да прыроды, да сваіх вытокаў?

— Сапраўды, пейзажаў дастаткова, мабыць, яны найбліжэйшыя да нашых вытокаў. І гэтым наша школа моцная, што мы захавалі такую традыцыйнасць. Мы не кідаемся ў крайнасці. Дзякуючы нашай Акадэміі мастацтваў, маладыя мастакі спрабуюць розныя напрамкі і знаходзяць нешта сваё. У нас такая прыгожая краіна, едзеш і аж вока радуецца. Дык чаму б не пісаць пейзажы?

— Асабіста вам які жанр падабаецца больш за ўсё?

— Мне падабаецца шмат што — Віцебская школа, традыцыйныя напрамкі. Я люблю савецкі сацрэалізм, не так даўно да яго прыйшла, нешта цягне. Не магу вылучыць нейкі адзін жанр. Бывае, глядзіш на карціну і яна не выклікае ніякіх пачуццяў, а ў кагосьці выклікае асацыяцыі, успаміны. І калі адбываецца «хімія» — гэта цудоўна, важна незалежна ад жанру.

— Лілія Валер'еўна, ёсць меркаванне, што да разумення мастацтва трэба «прыйсці». Што гэта значыць?

— Я падобнае пытанне задавала прафесійнаму калекцыянеру, калі пачынала паглыбляцца ў тэму мастацтва. Ён мне адказаў — «глядзі, глядзі, глядзі». Чым больш глядзіш на карціны, тым больш пачынаеш іх разумець, пачынаеш выбарачна да іх падыходзіць. Нешта пачынае больш падабацца, нешта менш і паціху прыходзіць разуменне.

— Часта можна пачуць, што пэўная карціна «дрэнная, няякасная». Але ці можна так сказаць пра твор мастацтва?

— Калі работа камусьці падабаецца, значыць, яна вартая ўвагі, калі не пакінула чалавека раўнадушным. Мастацтва можа радаваць і крыўдзіць. Зразумела, з прафесійнага пункту погляду ёсць моманты, якія ацэньваюцца, — і кампазіцыя, і спалучэнне колераў, і яшчэ шмат чаго. Нездарма ў Акадэміі мастацтваў гэтаму вучаць. Ёсць рознага кшталту моманты, на якіх засяроджваюць увагу спецыялісты. Ёсць правілы, якіх мастакам варта прытрымлівацца. Але калі карціна камусьці спадабалася значыць яна добрая як мінімум для гэтага чалавека.

— Назва вашай галерэі «АртХаос». Калі ўлічваць, што «арт» — гэта мастацтва, а «хаос» — беспарадак, можна зрабіць вывад, што назва галерэі — гэта творчы беспарадак?

— Мабыць, можна і так сказаць. Мы хацелі ў гэтым хаосе паказаць разнастайнасць мастацтва. Цяпер у галерэях прынята браць адзін кірунак і працаваць толькі з ім. А мы хочам паказаць усё беларускае мастацтва. І гэты хаос у нашым выпадку — разнастайнасць стыляў і кірункаў. У назве ў літары «о» намалявана літара «у». «Хаўс» — як вядома дом, сваё, роднае. Мы крыху «пагулялі» са словамі.

— Фестываль «Вытокі. Крок да Алімпу» амаль скончыўся. У выстаўкі «Кола часу» будзе працяг?

— Я спадзяюся, што «Вытокі» хоць і скончацца сёлета, але ў будучыні ў нейкай ступені застануцца. Гэтая ідэя вельмі блізкая нам, арганізатарам, і запатрабаваная ў рэгіёнах. Яна атрымала водгук. Таму мы знойдзем нейкую іншую форму ці пакінем гэту. Што датычыцца галерэі, то мы не хочам стаяць на месцы, мы пастаянна шукаем нешта новае. Будуць «Вытокі» — будзем працаваць з імі. Усё вымагае развіцця, ні ў якім разе нельга спыняцца, таму мы плануем удзельнічаць у розных праектах. Гэтым летам мы пазнаёміліся з цікавымі людзьмі па ўсёй краіне, яны нас запрашаюць да сябе. Думаю, нешта новае прыдумаем.

Валерыя СЦЯЦКО.

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа 5/2, пом. 1703, оф. 5**
Продавец	**Унитарное предприятие «Слуцкий рынок ОПС», Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, пл. Базарная, д. 13**
Оператор ЭТП	**ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46**
Адрес ЭТП	**www.ipmtorgi.by**

Предмет электронных торгов (одним лотом)
Адрес: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. Пугачева, д. 1А

Наименование (назначение)	Общая площадь	Инвентар. номер	Составные части и принадлежности
Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения	5375 кв. м	640/С-1801	Три навеса
Железная дорога (сооружение специализированное железнодорожного транспорта)	254,2 м	640/С-109925	-
Проходная (здание специализированное иного назначения)	37 кв. м	640/С-27612	Навес
Станция пожаротушения (здание специализированное иного назначения)	100,8 кв. м	640/С-27613	Подвал

Сведения о земельном участке: пл. **2,0419** га предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для размещения объектов неустановленного назначения

Начальная цена лота с НДС 20 % – 1 531 560,00 бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета электронных торгов

Оплата предмета аукциона (с учетом ранее внесенного задатка) производится в течение 5 (пяти) календарных дней с момента подписания договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов, установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: **www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 17.06.2021

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Дата и время начала и окончания электронных торгов	**Начало торгов: 16.08.2021 в 11.00. Окончание торгов: 16.08.2021 в 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов
Дата и время окончания приема заявок	**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 13.08.2021 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by**

Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06
E-mail: auction@cpo.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению КУП «СЛУЦКОЕ ЖКХ» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже одним лотом имущества в составе:

• изолированное помещение (наименование – помещение, назначение – складское помещение) общей площадью 404 кв. м с инв. № 640/D-63525, адрес: Минская область, г. Слуцк, ул. Гагарина, 36А-7.

• изолированное помещение (наименование – помещение, назначение – складское помещение) общей площадью 51 кв. м с инв. № 640/D-63526, адрес: Минская область, г. Слуцк, ул. Гагарина, 36А-8.

Начальная цена без НДС – **36 400,00** бел. руб. (задаток 10% от начальной цены – **3 640,00** бел. руб.).

Сведения о земельном участке: кадастровый номер 624650100001007805, площадь 0,3096 га, право общей долевой аренды.

Задаток перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Условия

1. В случае отсутствия необходимости изготовления проектной документации в течение одного месяца с даты государственной регистрации перехода права собственности на недвижимое имущество проинформировать Слуцкий районный исполнительный комитет (далее – райисполком) об отсутствии необходимости получения разрешения на разработку проектной документации, проведение проектно-изыскательных работ;

2. В случае необходимости проведения работы, требующей изготовления проектной документации:

обратиться в райисполком для получения разрешения на разработку проектной документации, проведение проектно-изыскательных работ не позднее одного месяца с даты государственной регистрации перехода права собственности на недвижимое имущество;

начать разработку проектной документации, проведение проектно-изыскательных работ в течение 6 (шести) месяцев с даты получения разрешения на разработку проектной документации, проведение проектно-изыскательных работ;

3. Согласовать с комитетом по архитектуре и строительству Минского областного исполнительного комитета предварительный проект на реконструкцию недвижимого имущества либо строительство нового с обязанностью его реализации;

4. Заключить договор купли-продажи недвижимого имущества на условиях, определенных райисполкомом.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609 (далее – Положение 609).

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) календарных дней с даты заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Организатор торгов имеет право отказаться от их проведения: в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона.

Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель) в течение 3 (трех) рабочих дней со дня их проведения. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в Положении 609, размещенном на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **31.08.2021** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **30.08.2021** до **16.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 136-31-11.
Тел. для осмотра: (8044) 585-09-38.

УНН 600154264

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703**
Продавец	**ОАО «Криница», г. Минск, ул. Радиальная, 52**
Оператор ЭТП	**ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703**
Адрес ЭТП	**www.ipmtorgi.by**

Предмет электронных торгов
Месторасположение: г. Минск, ул. Радиальная, 52

№ лота	Наименование	Инвентарный номер	Начальная цена (с НДС 20 %), бел. руб.
1	**Легковой седан Volvo S60**, рег. знак 9704 КЕ-7, 2001 г. в.	15272	6 480,00
2	**Легковой седан Шкода Октавия**, рег. знак 9625 ЕЕ-7, 2007 г. в.	12748	6 480,00
3	**Легковой универсал Ford Escort**, рег. знак 8202 МА-7, 1997 г. в.	19656	1 092,00
4	**Грузовой фургон Пежо Партнер**, рег. знак АА 7154-7, 2006 г. в.	12371	3 120,00
5	**Седельный тягач МАЗ 64221**, рег. знак КВ 1169, 1991 г. в.	2724	3 720,00

С подробной информацией по предмету электронных торгов можно ознакомиться на сайте организатора электронных торгов **www.cpo.by**. Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; в ОАО «Белинвестбанк» (г. Минску), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 15 (пятнадцать) рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. **Ответственность** участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение **10 (десять) процентов** от цены продажи лота в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Дата и время начала и окончания электронных торгов	**Начало торгов в 11.00 30.08.2021. Окончание торгов в 13.00 30.08.2021.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов
Дата и время окончания приема заявок	Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 26.08.2021 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by
Контактные телефоны	**+375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельский рыбокомплекс» (продавец) в лице управляющего в деле о банкротстве Журова С.В. извещает о проведении 12 августа 2021 года открытого повторного аукциона со снижением начальной цены на 90 % (лоты №№ 2, 4), на 50 % (лот № 5), на 80 % (лоты №№ 9, 10) по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб.	Шаг аукциона – 5 %, бел. руб.	Сумма задатка, без учета НДС (20 %), бел. руб.
	Подробные условия продажи опубликованы в газете «Звязда» от 23.02.2021 г. № 34 (29403). Местонахождение лотов: Гомельская обл., Гомельский р-н, г. Гомель, ул. Шилова, д. 16			
2	ТУ (теплоузел 11, инв. № 0023). Ворота металлические с ограждением (инв. № 1000). Ограждение (забор кирпичный, инв. № 1002). Проезжая часть (асфальтовое покрытие, инв. № 1008)	**95 380,00**	4 769,00	9 538,00
4	Склад (инв. № 0032). Склад (инв. № 0031). Склад (инв. № 0030). Склад (инв. № 0028). Навес (инв. № 0033). Навес (инв. № 0029)	**25 140,00**	1 257,00	2 514,00
5	**ДЕБИТОРСКАЯ ЗАДОЛЖЕННОСТЬ:** Речицкое РАЙПО (УНП 400037088)	**3 010,50**	150,52	301,05
9	Теплосети (инв. № 2002)	**940,00**	47,00	94,00
10	**Автомобиль ГАЗ 3307 КУПАВА** 473800, год выпуска – 2008, рег. № АВ 6424-3, тип ТС – грузовой фургон-рефрижератор, удовлетворительное техническое состояние, цвет – белый. СКТР 25 терминал ON-LINE (инв. № 3341)	**1 336,00**	66,80	133,60

Продавец: ОАО «Гомельский рыбокомплекс», г. Гомель, ул. Шилова, 16. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.:** 8 (044) 733-03-49 управляющий в деле о банкротстве Журов Сергей Вячеславович. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.**

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 30 июля 2021 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 10 августа 2021 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).**

Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. **Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 5 (пять) дней до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником** (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором торгов** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату услуг (вознаграждение) за организацию и проведение торгов, возместить затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **5(пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество, согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** с момента его подписания. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-З (ред. от 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)» ст. 127–129.

Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 23.02.2021 г. № 34 (29403). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by или www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы» и www.bankrot.gov.by.

Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 126-66-62.

ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, BELTORGI.BY

Продавец: **частное предприятие «СКВОЗЬ ВРЕМЯ»** (УНП 192840238) 220040, г. Минск, ул. Леонида Беды, д. 29, пом. 1Н (кабинет 3б) в лице ликвидатора ЗАО «Центр ликвидации и банкротства предприятий», тел. +375 29 148-01-01.

Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены: **10 августа 2021 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

№ п/п	Предмет торгов	Начальная цена предмета торгов, бел. руб. без НДС
1	**Печатная машина MAXIFLEX 820-B COLORI**	391 500,00
2	**Машина высокой печати Taiyo Label Printing Press TLS-250-8C+1F**	177 300,00

Местонахождение – г. Минск, ул. Промышленная, 21.

Телефон для ознакомления и осмотра +375 29 148-01-01.

Для участия в торгах необходимо в срок с 09.00 31.07.2021 г. по 17.00 09.08.2021 г.: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, уплатить аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 3 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок оплаты предмета торгов – не позднее 5 рабочих дней со дня заключения договора купли-продажи. Извещение о ране проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 22.06.2021 г.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
30 ліпеня 2021 г. № 29 (614)
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

МЯСЦОВЫ ЧАС

Фота БелТА.

БЯЗМЕЖНАЕ ЗЭЛЬВЕНСКАЕ ВАДАСХОВІШЧА: ЛЮДЗІ ЕДУЦЬ, БІЗНЕС — НЕ

Тапонім «Зэльва» ўтварыўся ад назвы рэчкі Зяльвянка, ледзь прыкметнай, але досыць доўгай (цэлых 170 кіламетраў), якая працякае па тэрыторыях пяці раёнаў і дзвюх абласцей. І няма такіх участкаў, дзе б гэтая рачулка не засталася без справы — яна напаўняе многія арашальныя каналы для забеспячэння ўрадлівасці палёў. Але Зяльвянка — гэта таксама цэлае мора, яна кіруе патокам, што праходзіць праз лопасці турбіны і дае электрычную энергію.

Гаворка ідзе аб Зэльвенскім вадасховішчы — найбуйнейшым вадаёме Гродзенскай вобласці, за 200 кіламетраў ад Мінска і 132 — ад абласнога цэнтра. Менавіта туды ў гарачы ліпень мы адправіліся на пляжны адпачынак.

стар. 18

У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ

ВАЖНА ПРАЦАВАЦЬ НА АПЯРЭДЖАННЕ І ДАВАЦЬ ПРАЎДЗІВУЮ ІНФАРМАЦЫЮ

Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА сустрэлася з маладымі парламентарыямі

У Савеце Рэспублікі адбылася сустрэча спікера верхняй палаты парламента з членамі Маладзёжнага савета пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь. Нагодай для актуальнай і шчырай размовы стаў год існавання дадзенай структуры. Якіх вынікаў работы за гэты перыяд атрымалася дасягнуць? У чым перспектывы далейшай дзейнасці Маладзёжнага парламента? Якія ідэі могуць быць карысныя для сенатараў? Усе гэтыя пытанні маладыя людзі абмеркавалі з Наталляй Качанавай.

У пачатку сустрэчы яна нагадала аб ранейшай дамове — перыядычных сустрэчах з ініцыятыўнай моладдзю з рэгіёнаў, каб мець магчымасць абмеркаваць найбольш актуальныя пытанні парадку дня:

— Мы павінны разам зверыць гадзіннікі ў нашай рабоце, бо гэта вельмі важна, — перакананая спікер верхняй палаты парламента.

(Заканчэнне на 8-й стар.)

АКЦЭНТЫ

Развіццё супрацоўніцтва

Днямі ў Савеце Рэспублікі прайшла сустрэча спікера верхняй палаты парламента Наталлі Качанавай з дзяржаўным сакратаром Саюзнай дзяржавы Дзмітрыем Мезенцавым.



Фота sovrep.gov.by.

Як паведамілі ў прэс-службе Савета Рэспублікі, падчас сустрэчы абмяркоўваліся пытанні рэалізацыі праграм Саюзнай дзяржавы, міжпарламенцкага супрацоўніцтва, у тым ліку ў рамках Парламенцкага сходу Беларусі і Расіі. Таксама ў цэнтры ўвагі быў шэраг змястоўных пытанняў саюзнага будаўніцтва.

Наталля КАЧАНАВА:

«Дэпутаты ўсіх узроўняў павінны працаваць з людзьмі пастаянна»

Такую задачу для дэпутацкага корпуса агучыла спікер верхняй палаты парламента падчас прыёму грамадзян па асабістых пытаннях, які яна правяла на мінулым тыдні ў Новалукомлі.

Нагадаем, што ў рамках адзінага дня прыёму грамадзян адбыўся маштабны выезд сенатарскага корпуса на Віцебшчыну (больш падрабязна аб яго выніках — у матэрыяле «Задача — выслухаць і дапамагчы» на стар. 3). У размове з журналістамі Наталля Качанава растлумачыла, чаму такія формы работы важныя — яны дазваляюць аператыўна рэагаваць на праблемы рэгіёна:

— Адзін з прыярытэтаў органаў улады — работа па раўнамерным развіцці рэгіёнаў. Гэта адзін з прыярытэтных кірункаў, які быў агучаны на шостым Усебеларускім народным сходзе. А для таго каб рэгіёны раўнамерна развіваліся, людзі заставаліся і жылі тут, павінны быць створаны ўсе ўмовы: павінна быць работа, функцыянаваць аб'екты сацыяльнага прызначэння, праводзіцца добраўпарадкаванне і гэтак далей, — перакананая яна. — Вядома, мы будзем аказваць дапамогу і падтрымку ў вырашэнні гэтых пытанняў.

Старшыня Савета Рэспублікі звярнула ўвагу яшчэ на адно важнае пытанне:

— Мы робім акцэнт на тым, што дэпутаты павінны актыўна далучыцца да работы з людзьмі: дэпутацкі корпус усіх узроўняў (пачынаючы ад сельскіх Саветаў і заканчваючы Саветам Рэспублікі, Палатай прадстаўнікоў) павінен працаваць з людзьмі пастаянна і трымаць на кантролі ўзнятыя пытанні, — падкрэсліла яна. — Дэпутаты павінны быць больш настойлівыя там, дзе вырашэнне гэтых пытанняў патрабуецца не толькі на мясцовым узроўні, а неабходнае ўмяшанне на больш высокім узроўні (напрыклад, міністэрстваў, ведамстваў). Таму тут мы хочам зрабіць акцэнт на тым, каб дэпутаты актыўна далучаліся да работы з людзьмі.

Вольга АНУФРЫЕВА.

МЕРКАВАННЕ

Сяргей РАЧКОЎ:

«Упэўнены, заходнія краіны з часам пераасэнсуюць сваю палітыку ў дачыненні да Беларусі»

Наша краіна заўсёды імкнулася развіваць аднолькава плённыя адносіны з усімі краінамі па ўсіх вектарах. Аднак час дыктуе неабходнасць карэкціроўкі знешнепалітычнай стратэгіі дзяржавы. Такую думку выказаў старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнароднай палітыцы і нацыянальнай бяспецы Сяргей Рачкоў падчас удзелу ў круглым стале, арганізаваным у «СБ. Беларусь сегодня».

Фота sb.by.

— Сёння стаіць пытанне аб тым, каб зрабіць акцэнт на развіцці адносін менавіта з тымі краінамі, якія хочуць узаемадзейнічаць з Беларуссю, развіваць палітычнае, гандлёва-эканамічнае, гуманітарнае супрацоўніцтва, — выказаўся сенатар. — Мы павінны зрабіць большы ўпор на работу ў тых дзяржавах, пра якія гаварыў Прэзідэнт на сустрэчы з кіраўнікамі дыпламатычных прадстаўніцтваў. Гэта краіны далёкай дугі і постсавецкай прасторы. У нас таксама шмат сяброў у Афрыцы.

Ён адзначыў, што ўсе гэтыя і іншыя аспекты будуць адлюстраваныя ў канцэпцыі знешняй палітыкі Беларусі, праект якой цяпер распрацоўваецца, у тым ліку з удзелам парламентарыяў, у Міністэрстве замежных спраў.

Якой жа мэтазгодна быць знешнепалітычнай стратэгіі дзяржавы ў цяперашніх умовах? На думку Сяргея Рачкова, нейтралітэт тут недарэчны:

— Мы шмат гаварылі аб прынцыпе нейтралітэту ў першыя гады незалежнасці нашай краіны. А потым заняліся канкрэтнымі прагматычнымі пытаннямі, у першую чаргу рашэннем эканамічных задач. І гэтая тэма перастала гучаць у дыскурсе. Цяпер мы зноў успомнілі пра тое, што ў Канстытуцыі ёсць такое палажэнне.

На маю думку, сёння быць цалкам нейтральным ва ўзаемазалежным свеце вельмі складана. Прынцып нейтральнасці ўключае тое, што Беларусь не накіроўвае Узброеныя Сілы за межы сваёй краіны.

Адсюль вынікае лагічная пазіцыя захавання шматвектарнасці знешнепалітычнай стратэгіі:

— Шматвектарнасць знешняй палітыкі нашай краіны намі адточана і праверана часам. Многія метады і формы работы апрабаваныя як МЗС, так і іншымі органамі, якія ўдзельнічаюць у рэалізацыі знешняй палітыкі, — перакананы ён.

Сенатар нагадаў, што асноўны яе прынцып — рэалізацыя эканамічных інтарэсаў і прасоўванне экспарту беларускіх тавараў і паслуг.

— З улікам таго што калектыўны Захад праводзіць палітыку санкцыйнага ціску на нашу краіну, і ў першую чаргу выкарыстоўвае эканамічны прэсінг, шматвектарнасць становіцца яшчэ больш актуальнай і неабходнай, — лічыць ён.

Старшыня профільнай камісіі задаецца пытаннем, ці чакаюць нас на ўсходнім кірунку, тым больш што ў кожнай краіны свае нацыянальныя інтарэсы?

— Але, на шчасце, у нас няма з большасцю краін нейкіх палітычных рознагалоссяў, — падкрэслівае ён. — Гэта гаворыць аб тым, што нам трэба засяродзіцца на рэалізацыі канкрэтных эканамічных, інвестыцыйных і гуманітарных праектаў.

Не засталася па-за ўвагай сенатара і ацэнка якасцяў дыпламата XXI стагоддзя:

— Наша дыпламатыя павінна быць вельмі практычнай, таму што час ставіць такія патрабаванні. Сёння вельмі важна быць настойлівымі, ставіць канкрэтныя мэты і іх дамагацца, — падкрэсліў Сяргей Рачкоў. — Хачу таксама заўважыць, што ў XXI стагоддзі дыпламат не павінен страціць класічныя рысы дыпламата і XIX, і XX стагоддзяў. Шырокі кругагляд, прафесіяналізм, уменне праводзіць перагаворы, выконваць этычныя патрабаванні і нормы — неад'емныя якасці.

Але галоўнае, на яго думку, — гэта любоў і адданасць сваёй краіне і свайму народу.

— Акрамя таго, XXI стагоддзе ставіць перад дыпламатам пытанне ўніверсальнасці. Таму сёння дыпламат павінен быць і маркетолагам, і эканамістам, і спецыялістам, які разбіраецца ў сучасных пытаннях знешняга гандлю, — перакананы Сяргей Рачкоў.

ВАЖНА ПРАЦАВАЦЬ НА АПЯРЭДЖАННЕ І ДАВАЦЬ ПРАЎДЗІВУЮ ІНФАРМАЦЫЮ

Трэба сказаць, што дамова выконваецца бездакорна — ужо прайшло некалькі плённых сустрэч. У прыватнасці, Наталля Качанава акцэнтавала ўвагу на актыўным удзеле юных парламентарыяў у мерапрыемствах сенатараў. Напрыклад, днямі прайшоў Прэзідыум Савета Рэспублікі ва Ушачах, дзе разглядалася тэма работы са зваротамі грамадзян у Віцебскай вобласці, у якім бралі ўдзел і маладыя калегі сенатараў.

— Я мяркую, што гэта выдатная школа і добры вопыт у рабоце, якія мы будзем працягваць, — падкрэсліла яна.

Наталля Качанава звярнула ўвагу на важнасць дзейнасці Маладзёжнага савета ў такім кірунку.

— Ва Ушачах я чарговы раз пераканалася, што нам як ніколі трэба больш сустракацца з людзьмі, а вам — з моладдзю, праводзіць сустрэчы ў аўдыторыях, размаўляць, тлумачыць, расказваць, — акцэнтавала яна ўвагу. — Таму што пытанні, якія былі зададзены, сведчаць аб тым, што людзі інфармацыйна яшчэ многага не ведаюць. Таму нам трэба вельмі актыўна працаваць з людзьмі.

Спікер верхняй палаты парламента ўпэўненая, што новая форма работы звязаная з правядзеннем адзінага дня прыёму грамадзян па асабістых пытаннях сенатарамі, вельмі карысная ў гэтых адносінах.

Дарэчы, яна анансавала наступны такі прыём, правядзенне якога запланавана ў сталіцы.

— Правядзём ва ўсіх адміністрацыях горада, а потым падвядзём вынікі на Прэзідыуме Савета Рэспублікі ў першай дэкадзе жніўня, — расказала Наталля Качанава.

Яна лічыць, трэба працаваць кропкава, таму што ўсе інфармацыйныя крыніцы, якія існуюць, сведчаць аб тым, што бруд і хлусня будуць працягвацца.

— Гэтага нам не пазбегнуць. Але важна працаваць на апярэджанне, гэта значыць, даваць праўдзівую інфармацыю, якая ёсць на самай справе, — звярнула яна ўвагу моладзі.

Аб праектах, якія ўжо рэалізаваны маладымі парламентарыямі і накіраваныя на праўдзівае адлюстраванне гісторыі, расказаў **старшыня Маладзёжнага парламента Ягор МАКАРЭВІЧ.**

Фота БелТА.

У прыватнасці, членамі Маладзёжнага савета ініцыяваны праект «Гістарычная памяць», у рамках якога ў Бярозе, што на Брэстчыне, у красавіку на месцы размяшчэння канцэнтрацыйнага лагера праведзены мітынг-рэквіем, а таксама абвешчаны збор сродкаў на стварэнне мемарыяльнага комплексу ахвярам палітычных рэпрэсій польскіх уладаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў перыяд 1921–1939 гадоў. Грошы ў выглядзе дабрачыннага ахвяравання накіроўваюцца на адмыслова адкрыты разліковы рахунак. Нялішнім будзе яго нагадаць: **BY70LBBI31341200000004836158**.

Акрамя таго, напярэдадні Дня Перамогі маладыя парламентарыі выступілі аднымі з ініцыятараў праекта «Алея Перамогі». З прадстаўнікамі грамадскасці і палітычных сіл падчас старту праекта ў

(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)

Фота БелТА.

сталіцы адбылася закладка аднайменнай алеі. Далучыцца да акцыі могуць любы беларус, высадзіўшы дрэва ў памяць аб загінулых у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Праекты па захаванні гістарычнай спадчыны працягнуліся. У сярэдзіне чэрвеня маладыя людзі правялі замену ўстарэлай мемарыяльнай дошкі ў памяць аб Сяргеі Прытыцкім у Мінску, выдатным савецкім і беларускім палітычным дзеячы, арганізатары камсамольскага падполля Заходняй Беларусі, удзельніку Вялікай Айчыннай вайны.

Новая мемарыяльная дошка адкрыта членамі Маладзёжнага парламента ў дату 50-годдзя з дня смерці Сяргея Прытыцкага.

> Ва Ушачах я чарговы раз пераканалася, што нам як ніколі трэба больш сустракацца з людзьмі, а вам — з моладдзю, праводзіць сустрэчы ў аўдыторыях, размаўляць, тлумачыць, расказваць, — акцэнтавала яна ўвагу. — Таму што пытанні, якія былі зададзены, сведчаць аб тым, што людзі інфармацыйна яшчэ многага не ведаюць. Таму нам трэба вельмі актыўна працаваць з людзьмі.

Што датычыцца актывізацыі інфармацыйнай дзейнасці ў інтэрнэце і сродках масавай інфармацыі, Ягор Макарэвіч расказаў аб запуску сайта Маладзёжнага парламента — mpns.by — дзе яго карыстальнікі актыўна інфармуюцца аб дзейнасці дадзенай структуры, у тым ліку ў сацыяльных сетках. Члены Маладзёжнага парламента пастаянна ўдзельнічаюць у розных тэлевізійных праектах, тым самым працуючы на апярэджанне, — і тут асноўны акцэнт робіцца на прыцягненне новых асоб з ліку маладых парламентарыяў.

— Так, у маі сумесна з патрыятычным блогерам Сцюшай Тайм запушчаны праект па асвятленні дзейнасці членаў Маладзёжнага парламента. Выпускі праекта транслююцца ў ранішнім блоку на тэлеканале «РТР-Беларусь», а таксама размяшчаюцца ў папулярнай у моладзі сацыяльнай сетцы «TikTok». Да бягучага моманту падрыхтаваны шэсць выпускаў праекта, — растлумачыў Ягор Макарэвіч.

Безумоўна, парадак дня маладых парламентарыяў вызначае і работа над законапраектамі, а таксама ўдзел ў рабоце над унясеннем змяненняў у Канстытуцыю.

Для арганізацыі ўдзелу членаў Маладзёжнага парламента ў заканадаўчым працэсе за кожнай профільнай камісіяй замацаваны пералік законапраектаў, якія знаходзяцца на разглядзе ў Палаце прадстаўнікоў і Савеце Рэспублікі. На сайце mpns.by функцыянуе электронная форма па зборы прапаноў ад моладзі па змяненні Асноўнага Закона Беларусі. Гэтыя прапановы агучваюцца на пасяджэннях Канстытуцыйнай камісіі старшынёй Маладзёжнага парламента.

Трэба сказаць, што ў рамках тлумачальнай работы ў студэнцкіх, школьных і працоўных калектывах члены Маладзёжнага парламента працягваюць сустракацца з моладдзю. Праўда, акцэнт такіх сустрэч у цяперашні час зроблены на збор прапаноў па змяненні Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

Цікавай з пункту гледжання сучаснага парадку дня выглядае і ініцыятыва стварэння маладзёжнага грамадскага аб'яднання «Рух наперад», якое выступіла аператарам нацыянальнага праекта «Каманда Будучыні» — конкурсу, задачай якога з'яўляецца пошук, развіццё і падтрымка перспектыўных лідараў, якія валодаюць высокім узроўнем асабістых якасцяў і кіраўніцкіх кампетэнцый. Дарэчы, ідэя правядзення гэтага конкурсу была агучана на шостым Усебеларускім народным сходзе.

Першы конкурс у кірунку «палітыка» быў праведзены ў сакавіку, яго пераможцы мелі магчымасць правесці адзін дзень у графіку работы Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі Качанавай. Практыка будзе працягнута, і цяпер вядзецца падрыхтоўка да правядзення наступнай спецыялізацыі конкурсу. Правядзенне новага кірунку запланавана на жнівень—верасень.

Гэтыя і іншыя праекты даюць магчымасць моладзі непасрэдна ўдзельнічаць у дзейнасці Маладзёжнага парламента.

Як патлумачыў Ягор Макарэвіч, уцягванне маладых людзей у дзейнасць кіраванай ім структуры адбываецца праз МГА «Рух наперад», а таксама форумную кампанію, у рамках якой прайшлі такія мерапрыемствы, як абласныя маладзёжныя форумы «Беларусь — гэта мы!», першы беларускі маладзёжны парламенцкі форум. У цяперашні час вядзецца падрыхтоўка да правядзення маладзёжнага прадпрымальніцкага форуму, які запланаваны на восень.

Вольга АНУФРЫЕВА.

Даведка МС

Маладзёжны парламент — гэта 70 актывістаў па ўсёй краіне. Яны праводзяць грамадскія прыёмныя, актыўна ўдзельнічаюць у дыялогавых пляцоўках і арганізацыях маладзёжных бізнес-інкубатараў.

У ліпені 2020 года Маладзёжны парламент быў створаны на грамадскіх пачатках як кансультатыўна-дарадчы орган.

У яго склад уваходзяць маладыя людзі з усіх рэгіёнаў ва ўзросце ад 18 да 31 года. Яны бяруць чынны ўдзел ва ўсіх падзеях верхняй палаты парламента; разам са старэйшымі калегамі выязджаюць у рэгіёны.

Сваё кіно

Класікі шмат не бывае

На наступным тыдні ў кінематаграфічным свеце адзначаць 100-годдзе дзвюх выдатных савецкіх актрыс Любові Маліноўскай і Любові Сакаловай, а ў эфіры сацыякультурнага тэлеканала гледачоў чакаюць паказы фільмаў вытворчасці «Беларусьфільма» з іх удзелам.

Артыстку Любоў Маліноўскую ўбачым у кінастужцы «Пасля кірмашу». Гэтая мастацкая кінагісторыя з'явілася ў 1952 годзе як экранізацыя па матывах п'есы Янкі Купалы «Паўлінка». Галоўную ролю ў фільме сыграла Людміла Сенчына, а Любові Маліноўскай тады дасталася роля Агаты. Акцёрскі склад той кінагісторыі ўвогуле быў зорным, бо там зняліся артысты Аўгуст Мілаванаў, Галіна Макарава, Міхаіл Пугачоўкін, Барыс Новікаў і іншыя.

Асвяжыць у памяці класічны сюжэт аўдыторыя зможа 31 ліпеня ў ранішнім эфіры ці ў паўторы ў панядзелак 2 жніўня ў 16.55.

А вось у кінастужцы «У бары брусніцы» (рэж. Яўген Васільеў), што таксама мае літаратурную аснову, якую склалі аповесці Леаніда Фралова «У бары брусніцы» і «Да сына», зможам назіраць за пераўвасабленнем у кадры Любові Сакаловай. Фільм падымае шэраг важных тэм, тут расказваецца і пра ўзаемаадносіны пакаленняў, і пра тое, што дзеці не заўсёды гатовыя аддзякаваць за сваё выхаванне... Дзве серыі — магчымасць убачыць дзве розныя рэчаіснасці, а разам з тым задумацца, ці настолькі ўжо ўстарэлі былыя погляды на сям'ю і пабудову ўзаемаадносін з блізкімі і роднымі людзьмі. Не прапусціце паказ у суботу ў 17.45.

Алена ДРАПКО.

ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 125

Міхаіл Кошаль з Мінска добра вядомы нашым чытачам як складальнік шахматных задач — пераважна двухходовых. Сёння ён прапануе свой новы твор, дзе мат белыя даюць за тры хады ***(гл. дыяграму).***

Белыя: Крh2, Фg7, Лb7, Сa3, пп. f3, g2 (6).

Чорныя: Крf5, Кf6, пе6 (3).

Мат за 3 хады.

Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі («Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

У Сочы адбыўся Кубак свету па шахматах. У мужчын прызавы фонд складаў 1 892 500 долараў, у тым ліку першы прыз — 110 тысяч. На першым этапе (1/128 фіналу) у барацьбу ўступілі 156 удзельнікаў, на другім (1/64 фіналу) да пераможцаў далучыліся яшчэ 50 гульцоў з больш высокім рэйтынгам. Кожны матч складаўся з дзвюх партый у класічных шахматы, пры нічыйным выніку гуляліся некалькі пар партый у хуткія шахматы (адведзены на партыю час пры гэтым усё больш змяншаўся) і, нарэшце, бліц.

На жаль, беларускі гросмайстар Кірыл Ступак выбыў з барацьбы ўжо на першым этапе, саступіўшы Х. Грэтарсану, — 1,5:2,5. Затое Уладзіслаў Кавалёў перайграў саперніка з лікам 2:0. У 1/64 фіналу Кавалёў атрымаў перамогу над расійскім гросмайстрам Аляксеем Саранам — 3,5:2,5, у 1/32 фіналу перайграў аўстралійца Бобі Чэнга — 1,5:0,5. Праўда, на чацвёртым этапе (1/32 фіналу) наш суайчыннік саступіў расійскаму гросмайстру Уладзіміру Федасееву — 0:2.

Бобі Чэнг — Уладзіслаў Кавалёў. 1. d4 Kf6 2. c4 e6 3. Kf3 Ce7 4. g3 d5 5. Cg2 0-0 6. 0-0 dc 7. Ke5 c5 8. dc Фc7 9. K:c4 Лd8 10. Фa4 Ф:c5 11. Kc3 Kd5 12. Лd1 Cd7 13. Фb3 Kc6 14. e3 K:c3 15. bc Ka5 16. K:a5 Ф:a5 17. a4 Ce8 18. Cd2 Лab8 19. Ce1 Л:d1 20. Ф:d1 Фc7 21. Фb3 b6 22. c4 a5 23. Cc3 Лd8 24. Ce4 Cc5 25. Фc2 h6 26. Фb2 f6 27. Фc2 Лd6 28. h4 Фf7 29. Лb1 Фd7 30. Лa1 Ch5 31. Cg6 Cf3 32. Лb1 Крf8 33. Крh2 f5 34. Cd4 C:d4 35. ed Ce4 36. Фc1 C:b1 37. Ф:b1 Л:d4 38. Ф:b6 Л:c4 39. h5 Кре7 40. Фb8 Лc2 41. Фе5 Л:f2+ 42. Крh3 Фd2 43. Ф:g7+ Крd6 44. Фf8+ Крd5 45. Фa8+ Крd4 46. Фa7+ Крd3 47. Фa6+ Крc2 48. Фc6+ Крd1, 0:1.

* * *

У жанчын барацьба пачыналася з 1/64 фіналу (78 удзельніц), да пераможцаў пазней далучыліся яшчэ 25 шахматыстак. Тут прызавы фонд складаў 676 250 долараў, у тым ліку першы прыз — 50 тысяч.

Вольга Бадзелька прайшла першую стадыю без барацьбы (саперніца не прыехала на турнір). На другім этапе ў вельмі напружаным паядынку Вольга перайграла грузінку Ану Матнадзэ — 5:4, але на трэцім, на жаль, саступіла расійскай віцэ-чэмпіёнцы свету Аляксандры Гарачкінай — 0,5:1,5.

Ана Матнадзэ — Вольга Бадзелька. 1. d4 Kf6 2. Kf3 c5 3. c3 b6 4. g3 Cb7 5. Cg2 g6 6. 0-0 Cg7 7. Ke5 C:g2 8. Кр:g2 0-0 9. a4 d6 10. Kf3 Kc6 11. Ka3 d5 12. Cf4 Лc8 13. Ke5 Kh5 14. Фd2 K:e5 15. de Фd7 16. Ch6 C:h6 17. Ф:h6 Ф:a4 18. f3 Kg7 19. g4 f6 20. Лfd1 Лcd8 21. ef Л:f6 22. Фg5 Ke6 23. Фе5 Kf4+ 24. Крh1 Лdf8 25. Ф:e7 Ле6 26. Фc7 Л:e2 27. Лe1 Фе8 28. Kc2 Kd3 29. Фd6 K:e1 30. Л:a7 K:c2 31. Ф:d5+ Фе6 32. Фb7 Лe1+ 33. Крg2 Фе2+ 34. Крg3 Лg1+ 35. Крh4 Ф:h2+ 36. Крg5 Ф:f4+, 0:1.

* * *

У Чэлябінску прайшоў Кубак Паўднёвага Урала. Кірыл Ступак фінішаваў у ім трэці, Мікіта Маёраў — сёмы.

* * *

Задача з мінулага выпуску рашаецца 1. Фb3! Першыя правільна адказалі Фёдар Карпей, Васіль Жуковіч, Сяргей Цяльпук, Васіль Барысевіч, Віктар Жук.

Вадзім Жылко.

Глядзі сваё кіно

ТАЛЕНАВІТЫ ЗНОЙДЗЕ САБЕ ДАРОГУ

Сваё 75-годдзе адзначыць 5 жніўня беларускі акцёр тэатра і кіно Уладзімір МІШЧАНЧУК. Тэлегледачы змогуць сустрэцца з вядомым майстрам сцэны ў тэлеэфіры: на «Беларусь 3» выйдзе выпуск праграмы «Кадры жыцця», прысвечаны юбіляру, а таксама ўбачым фільм і спектакль з удзелам артыста.

Мара пра акцёрства ва Уладзіміра Андрэевіча была з дзяцінства. Пасля заканчэння школы ён спрабаваў паступіць у Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут, аднак яго не прынялі, паколькі быў непаўналетні, хоць хлопец і вытрымаў тры туры іспытаў. І ўсё ж будучы артыст не здаўся, на наступны год пайшоў на курсы пры Доме народнай творчасці ў Брэсце, на танцавальнае аддзяленне, і потым працаваў як харэограф-пастаноўшчык у Драгічынскім доме культуры. А ўжо пасля заканчэння БДТМІ па размеркаванні трапіў у Гродзенскі абласны драматычны тэатр. Там і дырэктарам працаваў, і атрымаў званне Заслужанага артыста БССР. Праз пэўны час Уладзіміру Андрэевічу прапанавалі пасаду ў інстытуце, і ён вярнуўся ў Мінск. Трэба сказаць, што гады творчай і выкладчыцкай дзейнасці далі свой плён, сёння на рахунку майстра шэраг роляў у тэатры, кіно і шмат удзячных вучняў, якія таксама паспяхова рэалізуюцца ў прафесіі. Сам жа акцёр працягвае радаваць сваіх прыхільнікаў і дарыць ім свой талент са сцэны і з экрана. Вядомы ён і па працы на радыё і тэлебачанні, агучваў фільмы, серыялы...

Калі ўзяць яго ролі ў кіно, то многія могуць прыгадаць фільмы «Кіроўца аўтобуса» (1983), «Тры талеры» (2005), «У чэрвені 41-га» (2008) і іншыя. А на сацыякультурным тэлеканале ў дзень нараджэння акцёра тэлегледачы змогуць паглядзець кінастужку «Выкрасці Бельмандо». Камедыя рэжысёра Мікалая Князева была знята кінастудыяй «Беларусьфільм» і Белтэлерадыёкампаніяй у 2012 годзе. Па сюжэце нас чакаюць прыгоды маскоўскага пісьменніка Бакуніна ў беларускай вёсцы. Той заключае з выдаўцом пары, што за тры месяцы, не пакідаючы Парыж, зможа скончыць свой новы раман. Літаратар робіць стаўку ў выглядзе свайго любімага ката, а выдавец у выпадку пройгрышу абяцае аддаць рарытэтны аўтамабіль. Аднак ёсць адзінае «але» і яно крыецца ў тым, што замест Францыі пісьменнік трапіць у Беларусь, а дакладней, у вёску Парыж.

Фільм аб'яднаў у кадры многіх вядомых беларускіх і расійскіх акцёраў, сярод якіх Аляксандр Панкратаў-Чорны, Уладзімір Мішчанчук, Сяргей Журавель, Алег Несцераў, Ганна Бондарава і іншыя. А вось ката Бельмандо (яго паводле сцэнарыя скрадаюць злаўмыснікі) рэжысёр знайшоў на адной з каціных выстаў, аднак чаканні адносна ролі жывёла ўвасобіла хіба што толькі па знешнім выглядзе. Што ж датычыцца працы ў кадры, то тут гадаванец прымусіў панервавацца ўсю здымачную групу, бо каб дабіцца тых ці іншых рухаў і дзеянняў ад яго, кінавытворцам даводзілася рабіць шмат дубляў. Калі гаварыць пра месца здымак, то і тут усё склалася не з першага разу. Спачатку меркавалі зрабіць месцам дзеяння вёску Парыж у Віцебскай вобласці, аднак тая не прайшла пробы, і ў выніку здымалі ўжо ў Астрашыцкім Гарадку. Сапраўдную французскую сталіцу таксама ўбачым у кадры, але асноўныя падзеі ўсё ж разгортваюцца ў Беларусі. Нават Эйфелеву вежу давялося ўзводзіць... Глядзіце і натхняйцеся атмасферай прыгод.

Для тых жа, хто з'яўляецца таксама і прыхільнікам працы Уладзіміра Мішчанчука на тэатральнай сцэне, пакажуць спектакль Тэатра-студыі кінаакцёра «Хто смяецца апошнім» па п'есе Кандрата Крапівы, 125-годдзе якога таксама адзначаецца сёлета. У ім дзеянне хоць і бярэ пачатак у 1930-я гады і доўжыцца да нашых дзён, але адлюстроўваюцца праблемы, якія застаюцца актуальнымі і сёння.

А вось пачуць думкі, меркаванні самога Уладзіміра Андрэевіча будзе магчыма падчас прагляду праграмы «Кадры жыцця». Нагадаем, кожны выпуск праекта — гэта інтэрв'ю з вядомымі асобамі беларускай культуры. Вядучыя ў праграме не толькі вядуць гутарку з госцем, але і прапануюць, каментуючы тэлехроніку, згадаць адметныя старонкі жыцця. У выніку перад аўдыторыяй паўстае цэласная гісторыя жыцця выдатных творцаў і мастроў сваёй справы. Не прапусціце размову з Уладзімірам Мішчанчуком 5 ліпеня на «Беларусь 3».

Алена ДРАПКО.
Фота з адкрытых крыніц.

Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
Якія факты? Так, праблема сапраўды абвастрылася. Прычынай росту патокаў мігрантаў на тэрыторыю еўрапейскіх дзяржаў сталі ваенныя дзеянні ў шэрагу рэгіёнаў. Людзі бягуць ад вайны, ратуючы свае сем'і. Талерантная Еўропа сама ж запрасіла пацярпелых на Блізкім Усходзе. І што мы бачым? Вывелі няшчасных на беларуска-літоўскую граніцу, збілі, адкрылі стральбу па-над галовамі. Сярод пацярпелых нават цяжарная жанчына... Радыкальныя мусульмане, убачыўшы кадры таго, што адбываецца на граніцы Літвы, наўрад ці змогуць застацца абыякавымі.

У чым вінаватыя гэтыя людзі? І хто развязаў гэтыя ваенныя канфлікты? Рытарычныя пытанні.

* * *

Эльвіра САРОКА:

«Літва проста перагуляла сама сябе»

Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні — аб інцыдэнце на граніцы:

— Не так даўно вайскоўцы Лідскага пагранатрада затрымалі тры групы нелегальных мігрантаў — грамадзян Ірака, якія перайшлі граніцу з боку Літвы.

Затрыманыя паведамілі, што знаходзіліся ў літоўскім лагеры для бежанцаў. Жорсткія допыты, запалохванне, збіванне, катаванні, адсутнасць ежы і вады — тое, з чым сутыкнуліся гэтыя няшчасныя людзі, у кожнага адэкватнага чалавека выклікае шок.

Завяршальным акордам здзекаў было вось што: мігрантаў, сярод якіх былі дзеці і цяжарная жанчына, прывезлі на граніцу і пад пагрозай фізічнай расправы прымусілі сысці на тэрыторыю Беларусі, дзе, дарэчы, іх прынялі зусім па-іншаму і аказалі неабходную дапамогу, у тым ліку і медыцынскую.

Што ж атрымліваецца: аб'яднаная Еўропа, якая аб'яўляе сябе гарантам справядлівасці і дэмакратыі і безапеляцыйна заяўляе аб парушэнні правоў чалавека ў іншых краінах, у чарговы раз паказала свой сапраўдны твар — адкрыта хлуслівы і беспрынцыповы. Ці не вы, паважаныя «дэмакраты», яшчэ зусім нядаўна абвінавачвалі нашу краіну ва ўсіх мажлівых і немажлівых грахах усяго толькі за тое, што беларускі народ у жніўні мінулага года зрабіў свой сумленны і свядомы выбар і прагаласаваў за свабоду і незалежнасць дзяржавы? Вам не падабаецца, што Беларусь выбрала свой суверэнны шлях развіцця і ўпэўнена ідзе сваім курсам? Вас можна зразумець: маленькая краіна каля граніц Еўрасаюза сваім прыкладам паказала, як можна і трэба жыць, развівацца і заставацца незалежнымі, нягледзячы на шматлікія інфармацыйныя атакі, увядзенне эканамічных санкцый і жорсткага палітычнага ціску. І вас гэта раздражняе.

Сенатар перакананая, што цяпер Літва проста перагуляла сама сябе, нарэшце паказаўшы сапраўдную мараль дваістых стандартаў.

Матэрыялы падрыхтавала Вольга АЛЯКСАНДРАВА.

АКТУАЛЬНА

Асноўны Закон: традыцыі і навацыі

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей СІВЕЦ выказаўся ў ток-шоу «Па сутнасці» на тэлеканале СТБ адносна змяненняў, якія цяпер актыўна абмяркоўваюцца ў грамадстве, у Канстытуцыю нашай краіны.

— Мы закладваем у Канстытуцыю тыя інстытуцыянальныя рамкі, калідоры, якія б у далейшым, калі будзе эвалюцыяніраваць наша грамадскае жыццё, не паставілі б перад намі задачу зноў мяняць Канстытуцыю.

Што датычыцца артыкула 8, у нас не было ніколі — ні 15 сакавіка 1994 года, ні 24 лістапада 1996 года — закладзенага на канстытуцыйным узроўні прыярытэту нормаў міжнароднага права над нацыянальным заканадаўствам, у адрозненне ад той жа Расійскай Федэрацыі. У нас прыярытэт прынцыпаў міжнароднага права пазначаны, то-бок універсальных міжнародных прававых актаў. Мы ўсё ж такі стаялі каля вытокаў стварэння ААН, мы падпісалі Статут ААН. Гэтыя нормы ў нас у далейшым рэалізоўваюцца ў артыкуле 18 Канстытуцыі, дзе закладзена імкненне нашай дзяржавы да дзяржаўнага нейтралітэту.

У дачыненні да гістарычнай памяці, шлюбу як саюзу мужчыны і жанчыны і гэтак далей павінны быць сацыяльныя рэгулятары. А прававыя нормы павінны быць у самым канцы спіса.

У тэму

Ігар ГЕДЗІЧ, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, культуры, навуцы і сацыяльным развіцці:

— Змяненні ў заканадаўстве, аб якіх мы сёння гаворым, — гэта спосаб умацаваць і захаваць нацыянальную бяспеку беларускай дзяржавы, а таксама непаспяховае пацвярджэнне таго, што словы нашага Прэзідэнта не разыходзяцца са справай.

Вельмі важна, што сярод усіх навэл у Канстытуцыі ўвага аддаецца захаванню нацыянальных каштоўнасцяў, традыцый і культуры. Прыклад таму — замацаванне нормы, у якой сказана, што ў Беларусі шлюб — гэта саюз мужчыны і жанчыны. Асабліва з прычыны таго, як Захад актыўна спрабуе навязваць свету свае каштоўнасці. Мы ж жывём на сваіх законах і згодна са сваімі хрысціянскімі традыцыямі, і так будзе надалей.

ПРАБЛЕМЫ І РАШЭННІ

Аляксандр КАРПІЦКІ:

«Улада павінна не проста чуць людзей, а старацца падыходзіць творча і з душой да вырашэння іх праблем»

Днямі падчас святкавання Дня горада Каменца член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, галоўны ўрач Брэсцкай абласной бальніцы Аляксандр КАРПІЦКІ ўзяў удзел у адкрыцці сучаснай варкаўт-пляцоўкі для жыхароў горада.

Як паведамілі ў прэс-службе верхняй палаты парламента, пляцоўка добраўпарадкавана на праблемным месцы горада пры садзейнічанні сенатара пасля звароту да яго на прамую лінію жыхароў паўднёва-заходняга мікрараёна Каменца.

Адпаведны зварот парламентарый накіраваў у мясцовы райвыканкам, і пры першым наведванні Каменца сумесна з дырэктарам вытворчага прадпрыемства Каменецкай ЖКГ Паўлам Заграем наведаў праблемны аб'ект.

Да таго часу ўжо прымаліся меры па добраўпарадкаванні тэрыторыі. Праект варкаўт-пляцоўкі падрыхтавала камунальная арганізацыя.

— Калі ўлада не проста чуе людзей, а імкнецца падыходзіць творча і з душой да вырашэння іх праблем, тады асабліва прыемна, што і ты ўнёс сваю лепту ў добраўпарадкаванне горада, развіццё фізкультурнага руху, умацаванне здароўя гараджан, — падкрэсліў сенатар на адкрыцці пляцоўкі.

БЯЗМЕЖНАЕ ЗЭЛЬВЕНСКАЕ ВАДАСХОВІШЧА: ЛЮДЗІ ЕДУЦЬ, БІЗНЕС — НЕ

На таварным шляху

Пад'язджаць да Зэльвы хораша з усіх бакоў — горад знаходзіцца нібы ў нейкай нізіне, якую з аднаго боку ахоўваюць масіўныя лясы, а з другога — магутныя ветракі, што падпіраюць неба. Горад уражвае дагледжанасцю і спакоем — знаходзіцца тут вельмі прыемна.

У самім раённым цэнтры няма буйных прамысловых вытворчасцяў, але раней Зэльва была знакамітая сваімі кірмашамі. Менавіта ў гэтым паселішчы, што знаходзіцца на некалі ажыўленым гандлёвым шляху Мінск — Гродна — Беласток, актыўна гандлявалі коньмі і шматлікімі замежнымі таварамі, што прывозілі купцы са Швецыі, Даніі, Італіі, Прусіі, Аўстрыі, Францыі...

Дзеля захавання мясцовых традыцый і каштоўнасцяў у Зэльве кожны год праводзяць «Ганненскі кірмаш», а конь стаў своеасаблівым сімвалам горада. Яго скульптуру можна знайсці на цэнтральнай плошчы, таксама вобраз гэтай жывёліны намаляваны на гербе і сцягу пасёлка. У Зэльвенскім раённым выканаўчым камітэце нагадалі, што сёлета правядзенне кірмашу запланавана на 20—21 жніўня, таму мерапрыемства змогуць наведаць усе ахвотныя.

> Пакуль з наяўнага для адпачывальнікаў тут ёсць турбаза «Бераж кі» — месца добраўпарадкаванае, з вялікай колькасцю хатак побач з возерам, у якіх можна спыніцца. Яшчэ працуе гасцінічны комплекс «Белы ветразь», ёсць домік рыбака, некалькі аграсядзіб.

Але ўсё гэта бліжэй да восені, а пакуль цэнтрам прыцягнення з'яўляецца велізарнае — проста неабсяжнае з выгляду — Зэльвенскае вадасховішча. Туды мы і накіроўваемся — плаваць, загараць і забаўляцца.

Многае ў перспектыве

З першага погляду вадаём здаецца бязмежным, але калі быць дакладным, ён раскінуўся на больш чым 12 кіламетраў у даўжыню і на 2 кіламетры ў шырыню, а ў самых глыбокіх месцах дасягае 7,5 метра. Само ж Зэльвенскае вадасховішча маладое, яму пакуль няма і паўстагоддзя. Аднак з адведзенай роляй спраўляецца добра: акумулюе воды вясновых паводак, увільгатняе і арашае сельскагаспадарчыя землі, рэгулюе сцёк ракі Зяльвянкі.

У райвыканкаме расказалі, што ў летні сезон сюды прыязджаюць аматары воднага адпачынку і рыбаловы з усіх куткоў краіны. Для апошняй

Фота БелТА.

катэгорыі штогод праводзіцца чэмпіянат краіны па рыбнай лоўлі. Яно і відаць — акрамя вялікай колькасці людзей, якія прыехалі пазагараць і паплаваць на цэнтральным пляжы, па зялёных берагах, дзікіх і нязручных для плавання, відаць ніткі вуд. Радуе, што ўздоўж вадасховішча можна адправіцца па займальным і прыгожым турыстычным маршруце — ці на ровары, ці пешшу.

— Сёлета на цэнтральным пляжы Зэльвенскага вадасховішча з'явіліся ляжанкі, дзіцячая гульнявая пляцоўка, грошы на якія былі сабраныя на рэспубліканскім суботніку. Пабудавалі таксама яшчэ адну гандлёвую пляцоўку, дзе можна купіць прахаладжальныя напіткі або перакусіць, — кажа **Сяргей ЛОЙКА, намеснік старшыні Зэльвенскага райвыканкама.**

Справа ў тым, што Зэльвенскае вадасховішча знаходзіцца ў цэнтры перспектыў турызму ў раёне. Існуе цэлы комплексны план развіцця вадаёма. Напрыклад, абсталяванне стаянкі для маламерных суднаў, устаноўка на дамбе вулічных трэнажораў, адкрыццё кафэ, рэстарана, рыбнай вытворчасці, развіццё арганічнага рыбаводства.

Сёлета ўсе ахвотныя могуць узяць на пракат лодку або катамаран. Забарона існуе на катанне на катарах і маторных лодках. Таксама тут нельга займацца падводным паляваннем.

Бізнес зацікаўлены, але не ініцыятыўны

Аднак у астатнім у мясцовага бізнесу ініцыятыўнасць засталася на ўзроўні ідэйнасці.

Намеснік старшыні райвыканкама Ніна ГАЛЫНЯ заўважыла, што пакуль зацікаўленасць мясцовых прадпрымальнікаў — толькі на ўзроўні размоў, паколькі многія чакаюць, што за іх усё пабудуюць і арганізуюць.

— Але ўсё, што мы маглі пабудаваць для адпачынку на пляжы, мы зрабілі. Тым не менш у прадпрымальнікаў у дадзены момант зацікаўленасць невялікая, хоць ідэй шмат і ёсць добрыя прапановы, — растлумачыла Ніна Антонаўна.

> Сёлета ўсе ахвотныя могуць узяць на пракат лодку або катамаран. Забарона існуе на катанне на катарах і маторных лодках. Таксама тут нельга займацца падводным паляваннем.

Пакуль з наяўнага для адпачывальнікаў тут ёсць турбаза «Бераж кі» — месца добраўпарадкаванае, з вялікай колькасцю хатак побач з возерам, у якіх можна спыніцца. Яшчэ працуе гасцінічны комплекс «Белы ветразь», ёсць домік рыбака, некалькі аграсядзіб. У сезон траціць туды практычна немагчыма — лепш браніраваць месцы значна раней. З другога боку вадаёма знаходзіцца аздараўленчы лагер «Блакітная хваля», дзе цяпер адпачывае больш за сто дзяцей, якія прыехалі не толькі з рэгіёна, але і з усёй Беларусі. Там іх на спецыяльна абсталяваным пляжы вучаць плаваць.

Але прапаноў летняга адпачынку для сотняў адпачывальнікаў на берагах Зэльвенскага вадасховішча ўсё роўна мала. Людзі прыязджаюць на дзень ці два, хоць гатовыя адпачываць у падобных прыгожых і чыстых мясцінах не менш за ўік-энд. Глядзіш на маляўнічыя берагі — і на вочы просяцца санаторыі, пірсы, кемпінгі, палатачныя лагеры, кафэ і гасцявыя домікі...

Аліса СКІБА.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. **Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.

Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;

e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 29 ліпеня 2021 года.

БЫЎ САПРАЎДНЫМ ПАЛКОЎНІК!

...У той дзень Санёк заявіўся дамоў аж раніцай, сказаў:

— Дай чаго перакусіць. Стаміўся, як сабака! Міліцыі дапамагаў... Нейкія падшываны колы з машын паздымалі — мы ледзьве знайшлі.

Зоя, верачы ці не верачы, ставіла перад мужам падагрэтую вячэру і слухала — апроч іншага — як ляпаюць дзверы ў пад'ездзе, як суседзі спяшаюцца на работу. Ёй таксама трэба было, бо яшчэ ж і малую ў садок завесці...

— На сёння якія планы? — папытала нарэшце ў мужа. — Дома начуеш, ці пойдзеш зноў хуліганаў лавіць?

— Дык я ж не сам! Зразумей ты! — узяўся тлумачыць Саша. — Мяне з міліцыі папрасілі. Я на абходзе быў як работнік ЖЭСа...

— А я ўсю ноч не спала, перажывала за цябе, — не ўтрымалася ад папроку Зоя, адчуваючы, што гэта яшчэ не ўсе непрыемнасці.

— Не вядзі мяне ў садок, не хачу! — раскапрызілася дачушка.

— І добра... Хутка, можа, і праўда не пойдзеш, — стала ўгаворваць маці. — Я афармлю дэкрэтны, мы з табой будзем дома...

— І з татам?

— А як жа!

...З тыдзень пасля гэтага Саша быў чалавекам — можна сказаць, нават узорным мужам (дома ёй памагаў!), а потым зноў з'явіўся пад раніцу:

— Уяўляеш, ледзь не «замялі» на ваенныя зборы! — даводзіў жонцы. — Проста з работы... Насілу адкаснуўся! Увайдзіце, — кажу ваенкаму, — у маё становішча: дома дзіця малое, жонка цяжарная... Думаеш, хто зразумеў? Не! Усю ноч пратрымалі...

Зоя слухала ды моўчкі збірала на стол.

На рабоце яна таксама нікому нічога не сказала. Хіба сакратарцы — цішком — пра магчымыя зборы, пра ваенкамат.

— А ты схадзі туды, — параіла жанчына. — Скажы, што хутка ражаць... Папрасі, каб не чапалі твайго, бо ці мала што?

...У ваенкамаце жанчыну спыніў дзяжурны:

— Вам да каго?

— Да самага галоўнага, — шматзначна сказала Зоя. — Па асабістым пытанні.

Салдат спалохана зірнуў на яе жывот і адвёў у кабінет:

— Таварыш палкоўнік, да вас жанчына — цяжарная.

А далей — нібы ў кіно: той ваенкам — падцягнуты, строгі, у начышчаных да бляску ботах («Ён свае шкарпэткі, відаць, па хаце не раскідвае», — падумала Зоя) — прыязна ўсміхнуўся ёй, галантна падставіў крэсла, спытаў:

— Што прывяло?

— Ды папрасіць прыйшла, каб не бралі мужа на зборы. Мне, зразумейце, не сёння-заўтра ў раддом, — стала тлумачыць жанчына. — І калі яго забяруць...

— А хто сказаў, што павінны? — спытаў палкоўнік.

— Ён сам. Дамоў сёння пад раніцу прыйшоў. У вас, кажа, быў.

— І часта ён не начуе?

— Так. Апошнім часам здараецца — то з міліцыяй ноч прадзяжурыць, то ў ваенкамаце трэба прабыць.

Палкоўнік уважліва слухаў і...

— Ведаеце што? — сказаў раптам Зоі. — Вы не кажыце мужу, што тут былі. Навошта вам лішняя сварка? Беражыце здароўе — і сваё, і дзяцей. А вось муж няхай прыйдзе сюды. Я з ім пагавару. Перадайце яму вось гэтую позву. Скажыце, з ваенкамата прынеслі...

Цяпер ужо Саша верыў і не верыў у тое, што казала Зоя: крычаў, што не трэ было нейкім чужынцам дзверы адчыняць ды браць павестку, распісвацца за яе, што ён нікуды не пойдзе...

Але ж нідзе не дзеўся — схадзіў.

Назад вярнуўся злы, прыціхлы, з прыпухлай шчакой. Моўчкі перакусіў і лёг на канапу — тварам да сцяны.

Зоя глядзела на яго сагнутую спіну, на адну босую нагу (другая была ў шкарпэтцы) і ўсміхалася. Думала, як ёй усё ж пашчасціла, што палкоўнік аказаўся сапраўдным, што ён не толькі боты ўмее начышчаць!.. З Сашам, відаць, добра пагаварыў... Можа, пасля гэтага і зажывём як трэба?

Жанчына спадзявалася.

Валянціна Быстрымовіч,
г. Мінск.

І АДНО НЕ МЁД, І ДРУГОЕ НЕ РЭДЗЬКА

Стары анекдот: у аўцючак неяк спыталі, дзе яны мыюцца? «Як дзе? — здзівіліся жанчыны, — у рэчцы». — «Дык гэта ж летам. А зімой?» — «А колькі тае зімы...»

Прыстасаваліся, значыць, людзі, вырашылі праблему.

Тое ж некалі зрабілі і мы. Прычым удалы спосаб знайшлі: маглі не толькі бясплатна памыцца, а яшчэ і футбол паглядзець. Тым больш што тады, у пачатку 70-х мінулага стагоддзя, мінскае «Дынама», можна сказаць, грымела. Стадыён «Дынама» тады не пуставаў! Каб набыць квіток на чарговы матч, людзі загадзя займалі чаргу, падоўгу стаялі, плацілі грошы...

У студэнцкіх кішэнях яны, як вядома, ніколі не трымаліся...

А таму ў дзень чарговай гульні мы, адпрасіўшыся з апошняй пары, прыязджалі на стадыён (да 12 уваход быў вольны) і рабілі выгляд, што старанна рыхтуемся да чарговых спаборніцтваў: гэта значыць, бегалі па дарожках, скакалі ў даўжыню і вышыню, штурхалі ядро, падцягваліся на турніку...

І пры гэтым пазіралі на гадзіннік, каб бліжэй да 13, калі ўсіх папросяць са стадыёна, апынуцца ў душавых кабінах.

Мыцца там мы не спяшаліся, а наадварот: «працэс» стараліся расцягнуць аж да той пары, калі на стадыён пачнуць запускаць заўзятараў. Як толькі яны з'яўляліся, мы — чысцюткія — таксама праходзілі на трыбуны, займалі вольныя месцы (калі іх не было — стаялі ў праходзе).

Гэткі «фокус» нам удалося зрабіць разы тры ці чатыры. У чарговы — калі мы, памыўшыся, з канспектамі паселі на лаўцы ў чаканні гульні — дзверы душавой адчыніліся...

Мы сіганулі ў кабінкі. І адтуль ужо бачылі, што зайшоў супрацоўнік стадыёна, што забраў нашы канспекты, а, сыходзячы, дзверы зачыніў... на замок.

...З якім лікам выйграла тады мінскае «Дынама», мы маглі меркаваць толькі па шуме трыбун.

...Назаўтра нас, усіх чатырох, паклікалі ў дэканат і «мараль» не чыталі — проста на месяц пазбавілі стыпендый.

Факт, што хадзіць у душ на стадыён нам расхацелася: лепей, здалося, як тым аўцюкам, мыцца ў рэчцы.

П. Браток,
г. Мінск.

ЦІКАВЫ ПРАДМЕТ

...Лена (ці нават Леначка!), учарашняя выпускніца педінстытута, спраўдзіла сваю першую мару — атрымала дыплом і адразу ж стала Аленай Рыгораўнай, настаўніцай хіміі. Ёй падабаўся яе прадмет. І вучням, адчувала, таксама. Асабліва — хімічныя доследы.

Зрэшты, у той дзень яны і не плануваліся...

Тэмай урока была вада, і Алена Рыгораўна загадзя прадумала, як яе, гэтую «ваду», падаваць: спачатку разам з вучнямі і з дапамогай геаграфічнай карты яна адправіцца ў «падарожжа» па морах ды акіянах, потым раскажа пра мастакоў-марыністаў, прачытае верш, у тым ліку і свой...

Карацей, амаль увесь вечар перад гэтым урокам ішла яго «рэпетыцыя»: настаўніца, прыбраўшыся ў строгі касцюм, выкладала тэму перад люстэркам. І яно, гэтае выкладанне, было досыць цікавае!

Праўда, адзенне здавалася залішне цёмным і строгім.

...Настаўніца і не заўважыла, як пад рукі ёй падкруціўся кавалачак жоўтага штучнага футра, як пакрысе з яго атрымаўся прыгожы каўнерык і два сімпатычныя пампоны на вяровачках для завязкі... «І — падумала, — усё: больш ніякіх там пацерак-брошак! Усю ўвагу трэба сканцэнтраваць на вадзе — на тэме ўрока...». Так яе вучылі ў інстытуце.

І вось празвінеў званок. Алена Рыгораўна зайшла ў клас, напісала на дошцы формулу вады, паказала на карце рэкі і азёры, моры і акіяны, расказала пра мастакоў і паэтаў, якія ўслаўлялі гэтую стыхію...

Клас уважліва слухаў. Нават непаседу Колю Аліхвера быццам падмянілі: сядзеў-не варушыўся — вачэй не зводзіў з настаўніцы! «Што ні кажы, а хімія ўсё ж цікавы прадмет!» — радавалася яна.

Пад канец урока запісала на дошцы дамашняе заданне, проста так, на ўсякі выпадак спытала, ці няма пытанняў?..

Коля падняў руку, нават дзве!

— Нешта не зразумела? — звярнулася да яго настаўніца.

— Так, так, Алена Рыгораўна! — залапатаў хлопчык. — Калі ласка, скажыце, а дзе вы ўзялі такі прыгожы каўнерык? Ды яшчэ і з пампонамі?

Зоя Наваенка,
Глыбоцкі раён.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

Неасабісты суб'ектыў

ЛЮДЗЬМІ ЗВАЦЦА

Час, калі многае разумееш. І пра іншых, і пра сябе

УЧОРА «Фэйсбук» настойліва піскнуў і прапанаваў успомніць, што я рабіла два гады таму. Са здымкаў, на якіх было бяздоннае сіняе неба і старажытныя каменныя купалы і вежы Праванса, пацягнула водарам нагрэтай хвоі, лаванды і цім'яну. І — шчасця, якое здавалася тады такім звычайным: усяго толькі і трэба было, што купіць білет на самалёт...

Так, вы не паверыце, але ўсяго толькі два гады таму (тэрмін увогуле мізэрны ў параўнанні з вечнасцю) не было ні каранавіруса, ні закрытых граніц, ні палітычных пературбацый, ні пратэстаў, ад якіх становіцца горача то ў адным, то ў другім месцы нашага старога стомленага кантынента. А людзі — і суайчыннікі, і блізкія і далёкія суседзі па планеце — уяўляліся наогул сваім гэткім стракатым размаітым шматлікім натоўпам, які давялося два гады таму пабачыць падчас тэатральнага фестывалю ў Авіньёне. Цесна, шумна, але ніхто нікога не штурхае і не падганяе, усе адно аднаму ўсміхаюцца добразычліва, саступаючы дарогу і месца малым і старэйшым...

КАЛІ скончылася гэта наша цывілізаваная ідылія? Напэўна, разам з першымі паведамленнямі з захопленай эпідэміяй Італіі аб тым, што маладыя ўрачы адмаўляюцца заходзіць у дом да пажылых хворых: маўляў, хай паміраюць, а мы сваім яшчэ нядоўгім жыццём рызыкаваць не будзем... А памятаеце, як выштурхвалі з самалётаў «не сваіх», як ва Украіне перакапалі дарогу, каб не пусціць у паселішча эвакуяваных з Кітая суайчыннікаў?.. Тое, што лічылася заганным і нявартым нармальнага чалавека, стала лічыцца справай звычайнай. Чалавечыя подласць і эгаізм пачалі ўспрымацца не тое што без асуджэння, але паблажліва. І гэта быў толькі пачатак таго, што прынамсі ўсе еўрапейцы маюць сёння.

Успомніце, як усё пачыналася з тымі ж мігрантамі гадоў шэсць таму. Ветлівыя людзі са светлымі тварамі і высокімі пасадамі гаварылі пра тое, што багатая Еўропа гатовая дапамагчы бедным няшчасным бежанцам. Вядучыя выданні і тэлепраекты рабілі аналітыку пра тое, як добра, што гэтыя людзі прыехалі: карэнныя нацыі старэюць, і сярод свайго насельніцтва няма ахвотных даглядаць старых нямоглых людзей, якіх усё больш, бо жыць сталі даўжэй. А тут прыехала танная рабочая сіла, якая будзе ўдзячная дабрадзеям і пагодзіцца на ўсе ўмовы. Але — штосьці пайшло не так. За ўсімі гэтымі заклікамі і агульнымі разважаннямі забыліся, што тыя, хто прыйшоў прасіць прыстанішча, уцякаючы ад вайны і нястачы, — кожны з іх — Чалавек. Забыліся, а некаторыя, як нашы паўночныя суседзі, нават пра гэта і не ўспаміналі, бо нельга ж у мірны час у Чалавека цэліцца з аўтамата, нельга трымаць яго ў загоне, бы скаціну. Нельга адмаўляць яму ў праве на ўласную годнасць... Нельга? Аказваецца, можна, яшчэ як. І ніхто за гэта не папракне і не асудзіць...

Угэтым вэрхале, што адбываецца па ўсім свеце, беларусы выглядаюць, бадай што, прыстойней, чым многія іншыя. Пэўна, мы так доўга прагаворвалі гэта ўласнае жаданне «Людзьмі звацца», што, самі таго не заўважаючы, ператварылі яго ў маральны дэвіз, якім і стараемся кіравацца. А нам жа ў нейкім сэнсе было, дый сёння складаней, чым іншым. Бо, акрамя каранавіруса, яшчэ і паслявыбарная «хвароба» дае аб сабе знаць. Але хапіла, прынамсі ў большасці з нас, розуму, развазлівасці, той самай памяркоўнасці, за якую нас часта бэсцяць, не пасварыцца з-за палітыкі з суседзямі, з аднавяскоўцамі, з калегамі, не разарваць самыя галоўныя сувязі — сямейныя.

Праўда, і ў нас павылазіла ўсякая мярзота. І я тут не пра тых, хто фігуруе ў зводках міліцыі. Гэтых не затрымаюць і па тэлевізары не пакажуць. Вось, прызнайцеся: ёсць жа сярод вашых знаёмых хоць адзін чалавек, які за апошні год, прычым, можа, нават неаднойчы, як гэта сёння модна казаць, перабуўся. І тут не важна, з якога на які бок ён скакаў. І размова тут не пра перакананні, якія былі адны, а раптам памяняліся на іншыя. Прыстасаванства і адсутнасць гэтых самых перакананняў — вось як гэта называецца. Я такіх людзей называю цяпер швондзерамі. Вельмі падобныя яны на вядомага булгакаўскага персанажа. Нават не па паводзінах — па духу. Бо ўявіце, што рабіў бы герой Міхаіла Афанасьевіча — адданы рэвалюцыянер, апантаны ідэяй будаўніцтва камунізму, — у 1937-м? А ў 1942-м на акупаванай фашыстамі тэрыторыі? Жах, праўда, і ратуй нас божа ад такіх знаёмых!.. А з іншага боку, можа, і добра, што здарылася такая сітуацыя — затое разгледзелі, хто ёсць хто, дый не толькі пра іншых — самі пра сябе многае зразумелі.

...КАЛІ-НЕБУДЗЬ, напэўна, гледзячы ў бяздоннае блакітнае неба Праванса і ўсміхаючыся ў адказ шчаслівому стракатаму натоўпу, я буду думаць пра ўсё, пра што сёння пішу, як пра даўно мінулыя выпрабаванні, якія дастаюцца кожнаму пакаленню людзей. І пра тое, як урэшце мы, людзі, гэтыя выпрабаванні з гонарам пераадолелі. Прынамсі, вельмі хочацца ў гэта верыць.

Алена ЛЯЎКОВІЧ.

«ЗВЯЗДОЎСКІ» АДРАС —

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Сваёй гаспадаркі не трымаю, толькі курэй. Шмат клопату, ды і патрэбы ў гэтым няма, сёння ўсё можна купіць. Трымаю толькі курэй, добрая падмога на зіму — нарыхтаванага са свайго агарода хапае і мне, і дзецям. Наша вёска, у адрозненне ад неперспектыўных, жывая, паколькі знаходзіцца непадалёку ад Слуцка, — распавяла суразмоўніца. — Тут пражывае на пастаяннай аснове каля пяцісот чалавек. Летам прыязджаюць з горада дачнікі. У кагосьці застаўся бацькоўскі дом, а нехта набыў жытло пад лецішча.

Праходзім каля велічнага храма, які горда ўзвышаецца на пагорку. Гэта сапраўдная жамчужына рэдкага дойлідства — некалі кальвінісцкі збор, а цяпер касцёл Святой Варвары. У 2020-м споўнілася 400 гадоў з дня яго асвячэння. У савецкія часы ў ім было збожжасховішча, якое нанесла шкоду ўнутранаму інтэр'еру. Цяпер тут вісіць таблічка з просьбай захоўваць асцярожнасць. Храм належыць каталіцкаму прыходу, ксёндз жыве на тэрыторыі храма. Нядаўна ў яго доме здарыўся пажар, які пашкодзіў дах. Перад уваходам у касцёл — помнік удзельнікам Вялікай Айчыннай вайны.

Кідаецца ў вочы яркай плямай на фоне зеляніны і мясцовы Дом культуры. На франтоне і сценах звонку прыгожая мазаіка на тэму

Фрэскі на сцяне мясцовага Дома культуры, якія сімвалізуюць развіццё Краіны Саветаў.

станаўлення дзяржавы рабочых і сялян з асноўнымі сюжэтнымі лініямі: цяжкасці пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі, Грамадзянская вайна, індустрыялізацыя, Вялікая Айчынная, праслаўленныя пяцігодкі. У завяршэнне кампазіцыі — мужчына іграе на баяне, а калгаснікі танцуюць. Відаць, гэты сюжэт сімвалізуе поўную і канчатковую перамогу сацыялізму. Сярод гэтых фрэсак і мурал, прысвечаны газеце «Звязда». Заўважаю каля яго жанчыну з мужчынам і дваіх дзяцей.

Загадчыца паштовага аддзялення Вераніка ЦЕРАШКОВА з наведвальнікамі — жыхарамі вёскі.

— Едзем адпачываць на Рудянскае вадасховішча і заглянулі сюды — параілі знаёмыя, маўляў, паглядзіце на фрэскі, што на Доме культуры, сапраўдныя мастацкія творы, — кажуць яны.

У сельскім Доме культуры мяне сустрэла загадчыца Алена Нечапурэнка.

— У нас працуюць дзіцячыя гурткі па дэкаратыўна-прыкладным мастацтве, якія наведваюць вясковыя дзеці. Ім падабаецца майстраваць розныя дробныя работы. Стараюцца закончыць іх за адзін раз, каб тут жа забраць дадому, — кажа Алена Канстанцінаўна. Займаюцца дзеці таксама ў гуртку вакальна-харавых спеваў. У жаночым клубе «Гармонія» ўдзельнічаюць жанчыны розных узростаў.

Сама Алена Нечапурэнка стварае вырабы з ільняной ніткі ў тэхніцы джутавай філіграні. Часткі вырабляюцца на файле асобна і збіраюцца ў кампазіцыю. Можна выкарыстоўваць іншыя ніткі, але яна спынілася на льняной, бо лён — сімвал Беларусі, блізкі суайчыннікам матэрыял.

— Што датычыцца мурала, прысвечанага газеце «Звязда», то гісторыя яго стварэння мне невядомая. Працую загадчыцай толькі

чатыры гады. Але ёсць чалавек, якія валодае сітуацыяй, — адзначае Алена Канстанцінаўна. — Гэта Іван Іванавіч Пятровіч.

Іван Пятровіч працаваў у калгасе «Чырвоны Кастрычнік» сакратаром партыйнага бюро, намеснікам старшыні, а затым і старшынёй гаспадаркі. Затым калгас быў перайменаваны ў сельскагаспадарчы кааператыў, потым стаў сельскагаспадарчым філіялам «Агра-Замосце» адкрытага акцыянернага таварыства «Слуцкі камбінат хлебапрадуктаў».

— Менавіта пры мне ў 1974 годзе пачалі будаваць новы Дом культуры, які ўвялі ў дзеянне ў 1978-м. Ранейшы знаходзіўся ў старым драўляным будынку. Узводзілі гаспадарчым спосабам, гэта было танней, чым метадам падраду. Фрэскі, роспісы на яго вонкавых сценах з'явіліся ў 1981-м. Я як сакратар партбюро непасрэдна гэтым займаўся, — згадвае Іван Іванавіч. — Адразу распрацаваны праект цягнуў на 28 тысяч рублёў, на той час — вялікія грошы. За 30 тысяч рублёў можна было пабудаваць сучасны кароўнік без начыння. Таму галоўны бухгалтар, які прывык лічыць кожную капейку, быў супраць стварэння кампазіцыі. Але ўрэшце ўдалося яго пераканаць, і ён даў згоду. Ды нам удалося сэканоміць, праект абышоўся ў 22 тысячы рублёў. Таму што адразу была задума зрабіць суцэльны сюжэт на ўсю сцяну. Ды ў працэсе работы вырашылі размясціць кожную фрэску асобна.

Іван Іванавіч сам ездзіў у Мінск, раіўся са спецыялістамі, мастакамі, абмяркоўваў канцэпцыю. Эскізы паказалі кіраўніку гаспадаркі, які стварыў сваю камісію. Эскізы члены камісіі адобрылі.

— Не помню, якая гэта была арганізацыя са сталіцы. Але займаліся роспісам прафесіяналы, якія стварылі высокамастацкі твор, — лічыць Іван Пятровіч. — Працавалі цэлае лета, і ў 1981-м праект быў завершаны.

— Чаму газета «Звязда» займае пачэснае месца ў гэтай кампазіцыі? — пацікавілася ў свайго суразмоўніка.

— У Беларусі менавіта ў «Звяздзе» быў надрукаваны Дэкрэт Леніна аб зямлі. У аснове ідэі мурала — сяляне абмяркоўваюць артыкул.

— А на той час, як вы працавалі, ці выпісвалі ў калгасе «Звязду»?

— Вядома ж, прычым многія калгаснікі. Іх нікто да гэтага не прымушаў. Вось абласную газету мы вымушаныя былі крыху прасоўваць, — прызнаецца Іван Пятровіч.

— Прыязджалі ў гаспадарку карэспандэнты «Звязды»?

— Прыязджалі з розных газет, у тым ліку і ад вашага выдання, але

Багатая гісторыя

Чаму пан сядзеў пад мастом

Калісьці Покрашава і Замосце ўваходзілі ў валоданні аднаго маёнтка, які належаў памешчыку Каркузевічу. У складзе маёнтка акрамя гэтых вёсак былі яшчэ такія населеныя пункты як Адамова, Паўлаўка, Палікараўка, Жылін Брод, Старая Смалярня і іншыя.

Дом пана знаходзіўся ў маляўнічым месцы. Яго атачалі кусты бэзу і экзатычныя дрэвы. Непадалёку размяшчаўся вадаём. Каркузевіч меў вялікі сад, таму вуліца, дзе ён жыў, і цяпер называецца Садовай. Побач з домам былі і гаспадарчыя пабудовы: склеп для захавання прадуктаў харчавання, хлявы для буйной рагатай жывёлы і коней, амбары для зерня. Уладальнік памесця будаваў і новы дом. Але нехта спаліў новабудоўлю. Ходзяць байкі, што месцічы неяк заўважылі пана, які сядзеў пад мастом. А чаго ён там сядзеў ніхто не ведае.

Пазней вёскі, якімі валодаў Каркузевіч, набыла памешчыца Паўлоўская, якая, у сваю чаргу, прадавала лес і поле сялянам. Яны выкарчоўвалі дрэвы, распрацоўваючы плошчы пад ворыва. І пасяляліся тут на пастаяннае месца жыхарства. Сяляне таксама арандавалі лес, поле, луг, за што разлічваліся з Паўлоўскай пэўнай сумай грошай або зернем.

— Вёска атрымала назву Замосце таму, што паміж Покрашавам і Замосцем, у Чабатаровым лозе, знаходзіўся мост. Мястэчка было якраз за ім, — распавяла Алена Нечапурэнка. — А не зусім таму, што пан сядзеў пад мастом.

Час ішоў наперад. Вялікія змены адбыліся і ў Замосці. Не стала памешчыцкіх уладанняў, ім на змену прыйшлі калгасы. У студзені-лютым 1930-га ўтвораны калгас «Чырвоны будаўнік». Яго арганізатарамі былі загадчык пачатковай школы Шостак і загадчык хатай-чытальняй Мініч. Яны карысталіся падтрымкай мясцовага насельніцтва. Калгас быў заснаваны на базе дзвюх буйных кулацкіх гаспадарак: Каспяровіча з вёскі Руднаўка і Кобеля з пасёлка Плюшнік.

Першымі ў калгас уступілі яго актыўныя стваральнікі Максім Бенеш, Франц Лешчанка, Вікенцій Хацько, Аляксандр Хацько, Іпаліт Хацько, Фабіян Хацько і іншыя. Першым старшынёй стаў Максім Бенеш, які працаваў на гэтай пасадзе з 1930-га да 1933 года.

У тым жа 1930-м быў створаны калгас «Чырвоны Кастрычнік», куды ўвайшлі хутары. Пазней, у 1939-м, жыхары хутароў былі пераселены ў вёскі і пасёлкі.

Ва ўмацаванне гаспадаркі вялікі ўклад унеслі камсамольцы. Падчас Вялікай Айчыннай яна была дашчэнту разбурана. Пасля вызвалення ад нямецка-фашысцкай акупацыі калгас давялося аднаўляць нанова. Старшыні мяняліся часта, эканоміка развівалася марудна. У 1961 годзе старшынёй быў выбраны Аляксандр Філіпавіч Мішура. З гэтага часу калгас «Чырвоны Кастрычнік» пачаў упэўнена рухацца наперад. З кожным годам рос дабрабыт людзей. Калгаснікі, якія дасягнулі пэўнага ўзросту, пачалі атрымліваць пенсію. Была ўведзена гарантаваная аплата замест працадзён, што садзейнічала павелічэнню прадукцыйнасці працы.

Калгас «Чырвоны Кастрычнік» у розныя гады мяняў найменні. Цяпер — гэта сельскагаспадарчы філіял «Агра-Замосце» ААТ «Слуцкі камбінат хлебапрадуктаў».

ЗАМОСЦЕ

не магу назваць канкрэтныя прозвішчы — прайшло шмат часу.

— Раённае кіраўніцтва не ўмешвалася, не падстаўляла падножкі ў вашай справе?

— Гэта былі нашы грошы, і мы мелі права імі распараджацца самастойна, з раёнам праект не ўзгаднялі.

Пазней на старонцы ў «Фэйсбуку», прысвечанай Беларускаму савецкаму манументальнаму мастацтву, знайшлі інфармацыю пра тое, што аўтар мазаікі — мастак Вячаслаў Самсонаў.

Спрабую высветліць, ці выпісваюць сёння «Звязду» ў Замосці. З гэтай мэтай разам з Аленай Нечапурэнка кіруемся ў мясцовае паштовае аддзяленне. Па дарозе праходзім каля помніка.

— Гэта помнік удзельніку Вялікай Айчыннай вайны, ураджэнцу нашай вёскі Міхаілу Ісакавічу Мукасею, — тлумачыць мая правадніца. — Міхаіл Ісакавіч — савецкі разведчык — нелегал у ЗША і краінах Заходняй Еўропы, ганаровы супрацоўнік дзяржбяспекі, палкоўнік.

Бібліятэкар Ірына ГАНЧАР з дзецьмі — Данііламі і Ксеніяй (братам і сястрою).

Падпісчыца «Звязды», былая загадчыца аддзялення пошты Ганна ЛЕШЧАНКА з унукамі Ільёй, Сафіяй і Стэфаніяй.

... Размаўляем з загадчыцай паштовага аддзялення Веранікай Церашковай.

— Так, вашу газету чытаюць нашы жыхары. Адзін экзэмпляр выпісвае мясцовая бібліятэка, два ідуць на Покрашаўскі сельсавет. Ёсць і актыўныя падпісчыкі, даўняя сябры выдання, якія не здраджваюць яму многія гады. Напрыклад, такія як Ганна Лешчанка, — кажа Вераніка Аляксандраўна. — Калі вы пойдзеце да Ганны Палікарпаўны, то занясіце ёй свежы нумар.

— Я працавала амаль 40 гадоў загадчыцай пошты, — сустрэла нас у дварыы Ганна Палікарпаўна. — І практычна ўвесь час сябравала са «Звяздой». Спачатку выпісвала шмат іншых газет, але ўрэшце спынілася менавіта на вашай. І сёння мне ў ёй імпануе ўсё — шчырасць, любоў да чытача. Чытаю выданне ад першай да апошняй старонкі — навіны, матэрыялы аб палітыцы, эканоміцы, падабаецца рубрыка «Алё, народ на праводзе», парады, як даглядаць сад, агарод, невялікія апавяданні, якія знаёмяць з творчасцю маладых і сталых пісьменнікаў.

— А не заходзіце на сайт «Звязды»? — запыталася ў Ганны Палікарпаўны.

— У мяне ёсць дома камп'ютар, але ён пакуль не падключаны. Спадзяюся, што з цягам часу навучуся заходзіць і ў інтэрнэт, — гучыць у адказ.

Захацелася даведацца, як з работай у Замосці, ці хапае кадраў?

На тэрыторыі вёскі знаходзіцца сельскагаспадарчы філіял «Агра-Замосце» адкрытага акцыянернага таварыства «Слуцкі камбінат хлебапрадуктаў». Кіраўніка сельгасарганізацыі мы на месцы не засталі. Гэта і зразумела — жніво. Затое пагутарылі з інжынерам Юліяй Савіцкай. Юлія Аляксандраўна расказала, што гаспадарка займаецца вытворчасцю малака, вырошчваннем буйной рагатай жывёлы, збожжавых культур. Тут маюцца тры жывёлагадоўчыя фермы, дзе ўтрымліваецца паўтары тысячы галоў. Што датычыцца работы, то ў арганізацыі ўсе пасады занятыя, хапае галоўных спецыялістаў, спецыялістаў сярэдняга звяна, сярод якіх шмат моладзі. Яе дастаткова і на фермах — даяркі, жывёлаводы.

Маладым спецыялістам у гаспадарцы даюць жыллё — сямейным «прэзідэнцкія» домікі, а халастым — пакоі. Але некаторыя жывуць у Слуцку і кожны дзень ездзяць на работу ў «Агра-Замосце», як і Юлія Савіцкая. Для іх гаспадарка наладзіла падвоз туды і назад сваім транспартам. Што датычыцца вольнага часу, то моладзь ладзіць дыскатэкі па выхадных, адпачывае на прыродзе — непадалёку Руднянскае вадасховішча, ходзіць у Дом культуры, бібліятэку. А тыя, хто хоча іншых забаў, ездзяць у райцэнтр.

— Зарплата ў сельгасарганізацыі дастойная, — дадала Юлія Аляксандраўна. — Хто хоча працаваць, той і зарабляе.

— Вёска Замосце — гэта не аграгарадок. Але тут створаны ўсе неабходныя ўмовы для камфортнага жыцця, задавальнення жыццёвых і бытавых патрэбнасцяў. У камерцыйнай краме «Вікторыя» можна купіць неабходныя прадукты і тавары. Праўда, райспажыўсаюзаўскую краму часова закрылі. Але дадатковы магазін будзе створаны ў будынку канторы. Для гэтага зрабілі асобны ўваход, завозіцца абсталяванне. Акрамя таго, з горада кожную пятніцу прыязджае аўтакрама, як жартуем паміж сабой, ходзім на шопінг, хоць і не падабаецца гэтае навамоднае слоўца, — кажуць мясцовыя жанчыны. — Добра і тое, што ў маладых бацькоў не баліць галава, куды падзець малых, калі ідуць на работу. У дзіцячым садку яны пад пільным наглядам выхавацеляў. А свае таленты дзеці могуць раскрыць у дзіцячай школе мастацтваў. Ёсць у вёсцы і музычная, і сярэдняя школы.

Калі чалавек захварэў, то яму не трэба ехаць у райцэнтр. Можна звярнуцца ў Замосцкую ўрачэбную амбулаторыю, якая з'яўляецца структурным падраздзяленнем Слуцкай цэнтральнай раённай бальніцы і абслугоўвае вёскі Пакрашава, Рудня, Бабовішча, Адамова, Паўлаўку. Тут працуюць высокапрафесійныя спецыялісты, вядзецца прыём урача агульнай практыкі, ёсць акушэркі. Пры неабходнасці можна выклікаць медыка на дом. Праводзяцца таксама дваровыя абходы. Усе катэгорыі грамадзян запрашаюцца для праходжання дыспансерызацыі.

— Нягледзячы на тое, што мы знаходзімся ў глыбінцы, жывём паўнацэнным жыццём, — лічаць жыхары Замосця.

Казачны случчанін

Імя сапраўды выдатнага савецкага разведчыка Міхаіла Мукасея стала вядомае толькі ў пачатку XXI стагоддзя, калі ён разам з жонкай Лізаветай выдаў кнігу ўспамінаў «Зефір і Эльза. Разведчыкі-нелегалы». Гэта ён перадаў у Маскву інфармацыю ў ракавыя для краіны дні ў пачатку восені 1941 года пра тое, што японцы на СССР нападаць не будуць, што дазволіла прыняць рашэнне пра маштабнае перакідванне частак Чырвонай Арміі з Далёкага Усходу для абароны Масквы.

Міхаіл Мукасей нарадзіўся ў 1907 годзе ў мястэчку Замосце пад Слуцкам у яўрэйскай сям'і патомных кавалёў. Вучыўся ў Ленінградскім інстытуце ўсходніх моў. У 1937 годзе паступіў у разведшколу Генштаба РСЧА. З 1939 года — прафесійны разведчык, здабываў надзвычай важную інфармацыю аб пазіцыі ЗША напярэдадні вайны пад прыкрыццём пасады віцэ-консула СССР у Лос-Анжэлесе. З яго сям'ёй зблізіліся сем'і Тэадора Драйзера, Чарлі Чапліна, зорак нямога кіно Дугласа Фербенкса і Мэры Пікфард.

«У разведку, асабліва нелегальную, адбіраліся людзі з усёй краіны, іх вышуквалі, — расказаў у фільме «Лёс рэзідэнта. Аперацыя «Галівуд» (праект АНТ «Зваротны адлік», 2012 год) сын разведчыка, кінааператар Анатоль Мукасей. — Гэта павінны былі быць людзі з пэўным менталітэтам, з пэўным светапоглядам. Найвышэйшай адукаванасці людзі. З імі можна было размаўляць на любую тэму. Гэта былі казачныя людзі».

Ад нараджэння Міхаіл Ісакавіч ведаў ідыш, беларускую, рускую і польскую мовы, потым авалодаў англійскай, бенгальскай, французскай і іспанскай. Ёсць меркаванне, што разведчык Мукасей валодаў асаблівым дарам — абвостранай інтуіцыяй, якую атрымаў у спадчыну ад свайго дзеда.

Яго сваякоў, якія засталіся ў Замосці (больш за 11 чалавек), у 1942 годзе фашысты сагналі ў Капыль і расстралялі. Сам Міхаіл Ісакавіч пражыў 101 год, з іх 30 — у якасці разведчыка-нелегала разам з жонкай за мяжой.

Суровы, строгі, велічны

Гістарычныя звесткі пра касцёл святой Барбары ў вёсцы Замосце Слуцкага раёна вельмі скупыя. Вядома, што будынак быў фундзіраваны ў 1620 годзе (па іншых звестках — у 1649-м) мясцовым шляхцічам Андрэем Самуілам Вінкам-Ратамскім, а пазней, у тым жа XVII стагоддзі, пры ім была місія езуітаў.

Даследчыкі лічаць, што будынак мог быць узведзены мясцовымі непрафесійнымі дойлідамі: на гэта ўказваюць адыход ад восевай сіметрыі, некананічная аб'ёмна-прасторавая пабудова, увядзенне ў муроўку буйных валуноў, адсутнасць выразных стылёвых рыс. Будынак складаецца з квадратнага ў плане асноўнага аб'ёму, асіметрычна ссунутай адносна падоўжнай восі храма пяціграннай апсіды і высокага першага яруса вежы-званіцы, якая не захавалася. Незвычайна, пад вуглом, да апсіды далучаны нізкія сакрыстыі. Высока ўзнятыя арачныя аконныя праёмы, магутнае канструкцыйнае рашэнне, простыя двухсхільныя дахі надаюць храму абарончы характар.

Гісторыка-стылістычны аналіз дазваляе меркаваць, што першапачаткова гэта быў, верагодна, кальвінісцкі збор. У гэтым пераконвае яшчэ і тое, што ў першай палове XVII стагоддзя (да 1669 года) удзельным Слуцкім княствам валодаў князь Багуслаў Радзівіл, кіраўнік евангелісцкай абшчыны ў Вялікім Княстве Літоўскім, таму з'яўленне місіі езуітаў пад Слуцкам раней за другую палову XVII стагоддзя малаверагоднае, адзначаюць гісторыкі.

Асаблівасцю храма з'яўляецца незвычайнае вырашэнне алтарнай часткі ў выглядзе гранёнай апсіды з моцна скошанымі бакавымі гранямі, у выніку гэтага ўнутры яна прасторава зліваецца з кафаліконам — малітоўнай залай храма. У апсідзе фрагментарна ўцалела цыліндрычнае скляпенне, дэкарыраванае ромбападобным сеткавым арнаментам з нізкім рэльефам лепкі. У галоўным алтары знаходзілася карціна мастака Сымона Чаховіча «Укрыжаванне». Інтэр'ер храма захаваў архаічна суровую архітэктурную трактоўку, адзначаюць даследчыкі культавай архітэктуры.

Ёсць сведчанні, што некаторы час у канцы XVIII стагоддзя ў будынку касцёла быў уніяцкі храм у гонар Прасвятой Багародзіцы. 1 чэрвеня 1795 года каменная царква ў Замосці была далучана да праваслаўя і разам з ёю прыходскія вёскі. Праваслаўным храм заставаўся на працягу васьмі наступных гадоў, да 1802 года ўключна. Пасля будынак быў перададзены католікам і зноў стаў касцёлам.

У 1865 годзе ён быў пераасвячоны ў праваслаўную царкву. Пасля 1920 года выкарыстоўваўся як культурная і гаспадарчая ўстанова. З 1993 года касцёл пасля рэстаўрацыі паводле праекта архітэктара В. Кондраля дзейнічае зноў.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ, Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА, фота Анатоля КЛЕШЧУКА.
в. Замосце Слуцкага раёна.

Организация: **ОБЩЕСТВО С ОГРАНИЧЕННОЙ ОТВЕТСТВЕННОСТЬЮ**

«ДАТЧ СТАР»

Учетный номер плательщика: 191061436
Вид экономической деятельности: 68320
Организационно-правовая форма: хозяйственное общество

Орган управления: общее собрание участников
Единица измерения: тыс. руб.
Адрес: 220069, г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 19, оф. 860

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 30 июня 2021 г.

АКТИВЫ	Код строки	На 30 июня 2021 г.	На 31 декабря 2020 г.
1	2	3	4
I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства:			
первоначальная стоимость	101	1 522	1 304
амортизация	102	(286)	(542)
остаточная стоимость	110	1 236	762
из нее остаточная стоимость ОС, переданных ОАО по договору безвозмездного пользования	110а	-	-
Нематериальные активы:			
первоначальная стоимость	111	15	14
амортизация	112	(13)	(12)
остаточная стоимость	120	2	2
Доходные вложения в материальные активы:			
первоначальная стоимость	121	1 913	1 608
амортизация	122	(291)	(279)
остаточная стоимость	130	1 622	1 329
в том числе:			
инвестиционная недвижимость	131	1 017	455
предметы финансовой аренды (лизинга)	132	605	874
прочие доходные вложения в материальные активы	133	-	-
Вложения в долгосрочные активы	140	3 087	3 412
Долгосрочные финансовые вложения	150	1 502	1 710
Отложенные налоговые активы	160	-	-
Долгосрочная дебиторская задолженность	170	-	-
Прочие долгосрочные активы	180	-	-
ИТОГО по разделу I	**190**	**7 449**	**7 215**
II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы	210	4 677	5 041
в том числе:			
материалы	211	58	49
животные на выращивании и откорме	212	-	-
незавершенное производство	213	491	334
готовая продукция и товары	214	4 128	4 658
товары отгруженные	215	-	-
прочие запасы	216	-	-
Долгосрочные активы, предназначенные для реализации	220	42 973	35 318
Расходы будущих периодов	230	2 678	109
в том числе: курсовые разницы	231	-	-
Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам	240	718	534
Краткосрочная дебиторская задолженность	250	13 594	9 521
по налогам и сборам в бюджет	251	8	280
из неё инновационного фонда Минстройархитектуры	251а	-	-
инвестиционного фонда Минстройархитектуры	252	-	-
Краткосрочные финансовые вложения	260	526	517
Денежные средства и эквиваленты денежных средств	270	4 953	1 138
в т.ч. денежные средства на депозитных счетах	271	3 991	136
Прочие краткосрочные активы	280	-	-
в том числе недостачи и потери	281	-	-
ИТОГО по разделу II	**290**	**70 119**	**52 178**
БАЛАНС	**300**	**77 568**	**59 393**

